Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 1 1932 г. № 220 (4472) Год выданьня XVI

Тургеневская бібліятэка ім. Горкага

ин. 2668

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Па-баявому правесьці агляд нізавых ячэек Асоавіяхіму.
А. СТЭЦКІ — Саракагодзьдзе літаратурнай дзейнасьці Максіма Горкага (2 стар.).
УЛ. СЕВЕРНЫ—Сыгналіст грае «пападзі»... (3 стар.).
АБ СТАНОВІШЧЫ РАБОТЫ СЯРОД ЖАНЧЫН - ВЫЛУЧЭНАК — Пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).
Не адкладваць зябліва да скончэньня сяўбы (1 стар.).
Дырэктыва, ператвораная ў цэнтнэры (3 стар.).
Уключаемся ва ўсесаюзнае спаборніцтва (3 стар.).
ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).
ЗА МЯЖОЙ:
Падрабязнасьці роспуску германскага рэйхстагу (4 стар.).
Малюнак жыцьця беспрацоўных у Польшчы (4 стар.).
Правакацыйная работа белагвардзейцаў у Харбіне (4 стар.).

Па-баявому правесьці агляд нізавых ячэек Асоавіяхіму

Трэцім пашыраным пленумам Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму СССР, які адбыўся ў красавіку месяцы г. г., пастаўлена баявая задача «асноўную ўвагу, сілы і сродкі таварыства згуртаваць на задачах разгортваньня вайсковай падрыхтоўкі працоўных, авіярабоце, СПА, хімабароне, ваеннатэхнічнай прапагандзе і на палітычным выхаваньні ўсёй масы сваіх членаў з мэтай выпрацоўкі з іх сьвядомых, актыўных змагароў за справу абароны краіны, якая будуе сацыялізм».

Узьнімаючы якасьць усёй абароннай работы таварыства, мы павінны ператварыць Асоавіяхім у сапраўдны баявы рэзэрв рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, мы павінны ператварыць кожны завод, кожную фабрыку, МТС, саўгас і калгас у крэпасьць абароны.

Выкананьне гэтых адказьнейшых і разам з тым ганаровых задач патрабавала і патрабуе карэннай перабудовы работы асоавіяхімаўскіх арганізацый, паставіўшы ў цэнтр увагі важнейшае і рашаючае зьвяно—ячэйку, якая зьяўляецца арганізатарам і правадніком усіх масавых мерапрыемстваў абароннай работы сярод рабочых, калгасьнікаў і працоўных.

Між тым, ня гледзячы на тое, што з часу 3-га пленуму ЦС ААХ СССР ужо прайшло 6 месяцаў, асоавіяхімаўскія арганізацыі БССР ня могуць яшчэ рапартаваць аб поўнай перабудове, сваёй работы ў адпаведнасьці з рашэньнямі пленуму.

Работа нізавой ячэйкі яшчэ ня стала сапраўды ў цэнтры ўвагі Асоавіяхіму. Яшчэ не наладжана дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва, якое выходзіла-б «з уліку ўмоў і асаблівасьцяй кожнай ячэйкі і характару вытворчасьці».

Гэта з усёй яскравасьцю пацьвярджае хаця-б ход пераўліку членаў Асоавіяхіму БССР. Гэтай важнейшай кампаніі не надана ў значнай частцы мясцовых арганізацый належнага палітычнага значэньня.

Інакш чым-жа можам тлумачыць тое, што гэты пераўлік па большасьці раёнаў БССР праходзіць яўна нездавальняюча, што замест росту членаў Асоавіяхіму ў выніку пераўліку па прыкладзе асобных раёнаў (Клімавіцкі, Заслаўскі і інш.) мы маем і адсеў членаў таварыства ў такіх арганізацыях, як Асьвейская, Уваравіцкая, Дрысенская і інш. Чым-жа тлумачыць, што пераўлік у значнай частцы раёнаў, ня гледзячы на тое, што апошні тэрмін быў 1 кастрычніка, яшчэ ня скончан і нават у некаторых раёнах толькі распачынаецца.

Асноўная прычына такіх буйных недахопаў у рабоце раду раённых і нізавых арганізацый ААХ БССР—адсутнасьць баявых тэмпаў у перабудове работы на аснове пастаноў 3-га пленуму ЦС, невыстарчальная ўвага і кіраўніцтва з боку раду РК КП(б)Б (характарным прыкладам можа служыць Мсьціслаўскі РК КП(б)Б) і з боку значнай часткі нізавых партыйных арганізацый.

У рабоце арганізацый Асоавіяхіму яшчэ невыстарчальна разгорнута самакрытыка.

«Голас самакрытыкі павінен гучэць больш рашуча ва ўсіх арганізацыях Асоавіяхіму... Пралетарская самакрытыка павінна зрабіць сваю справу ва ўсіх арганізацыях Асоавіяхіму і на яе аснове павінна праходзіць перабудова работы ячэек Асоавіяхіму» (В. Молатаў).

Трэба цьвёрда памятаць, што без узмацненьня штодзённага кіраўніцтва і актыўнага ўдзелу з боку мясцовых партыйных арганізацый у перабудове работы Асоавіяхіму, без прыцягненьня да гэтай работы шырокіх мас усёй пралетарскай грамадзкасьці і асабліва камсамолу, без рашучага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі—немагчыма перабудова работы.

Прапаганда абароннай работы, перабудова асоавіяхімаўскіх арганізацый павінна весьціся не ізалявана ад іншых гаспадарча-палітычных задач. Яна павінна быць шчыльна зьвязана з задачамі барацьбы за выкананьне плянаў завяршальнага году першай пяцігодкі, за выкананьне вытворчых заданьняў у цэху і брыгадзе, на сацыялістычных палёх саўгасаў і калгасаў.

«Толькі ўдарнік-энтузіяст сацыялістычнай будоўлі можа лічыцца сапраўды актыўным членам Асоавіяхіму, можа быць вартым гэтай ганаровай назвы» («Праўда»).

Ад кожнага члена таварыства патрабуецца спалучэньне ўдарнай работы на вытворчасьці з баявой ваенна-палітычнай вучобай.

Перабудова работы Асоавіяхіму, умацаваньне ячэйкі, як важнейшага і рашаючага зьвяна, павінны весьціся на аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, бязьлітаснага адпору клясаваму ворагу і яго агентуры—правым і «левым» апартуністам.

Бязьлітасна павінна выкрывацца і весьціся рашучая барацьба з фактамі праваапартуністычнай недаацэнкі ваеннай небясьпекі, з недаацэнкай работы па абароне краіны, а гэта значыць і недаацэнкай усёй важнасьці ролі і задач, якія пастаўлены перад Асоавіяхімам.

Усесаюзны агляд работы нізавых ячэек Асоавіяхіму, які праводзіцца з 1 кастрычніка па 1 студзеня 1933 году, ставіць сваёй асноўнай задачай «выкарыстаць і перанесьці вопыт лепшых нізавых ячэек таварыства для рашучага ажыўленьня і павышэньня якасьці работы ячэек і іх далейшай барацьбы за ператварэньне заводаў, МТС, саўгасаў і калгасаў у крэпасьць абароны.

Агляд павінен дапамагчы сапраўднай перабудове ячэек Асоавіяхіму, на аснове пастаноў 3-га пленуму ЦС, і садзейнічаць: шырокаму разгортваньню масавай вайсковай работы ў цэху, брыгадзе, на палявых работах і г. д.; узмацненьню масавай ваенна-палітычнай работы сярод членаў Асоавіяхіму—рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў—па пытаньнях ваеннай небясьпекі і ўмацаваньня абараназдольнасьці краіны; уцягненьню ў рады таварыства новых членаў і ахопу іх практычнай работай у гуртках, камандах і г. д.» (З умоў усесаюзнага агляду работы нізавых ячэек АСО).

У аглядзе павінны прыняць удзел усе нізавыя ячэйкі Асоавіяхіму.

Работа па агляду павінна быць узначалена раённымі і нізавымі партыйнымі арганізацыямі. Вакол агляду і наогул работы Асоавіяхіму трэба мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць БССР. Райкомы КП(б)Б павінны ўзяць раўненьне на Клімавіцкі РК, сакратар якога тав. Крыпец прэміяваны гэтымі днямі ЦС Асоавіяхіму БССР за ўзорную пастаноўку і кіраўніцтва асоавіяхімаўскай работай.

Вялікую ролю ў правядзеньні агляду павінен адыграць раённы, нізавы друк і рабселькоры.

Па прыкладу гомельскай, барысаўскай, клімавіцкай, віцебскай, мазырскай і старобінскай раённых газэт увесь друк павінен практычна апэратыўна ўключыцца ў агляд.

Асноўнай формай работы зьяўляюцца масавыя рэйды (з удзелам актыву Асоавіяхіму, рабселькораў, чырвонаармейцаў падшэфных часьцей і камсамолу) па праверцы выкананьня канкрэтных паказальнікаў работы ячэек Асоавіяхіму, з асьвятленьнем іх работы ў нізавым, раённым і цэнтральным друку.

Міжнародная абстаноўка, усё больш нарастаючая небясьпека імпэрыялістычнай вайны і інтэрвэнцыі супроць Савецкага саюзу, якая маскуецца пацыфісцкай балбатнёй у Жэневе, патрабуе максымальнага ўзмацненьня абароннай работы, патрабуе ад кожнага працоўнага быць гатовым кожную хвіліну стаць на абарону сацыялістычнай краіны.

Узорным правядзеньнем усесаюзнага агляду, рашучай перабудовай работ Асоавіяхіму, ператворым Асоавіяхім у сапраўдны баявы рэзэрв Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

АБ СТАНОВІШЧЫ РАБОТЫ СЯРОД ЖАНЧЫН-ВЫЛУЧЭНАК

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б канстатуе, што ня гледзячы на велізарнейшы рост актыўнасьці працоўных жанчын, павялічэньне ўдзельнай вагі ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы, павялічэньне колькасьці іх у выбарчых органах — саветах і калгасна-кааперацыйнай сыстэме, за апошнія часы з боку цэнтральных устаноў, раённых партыйных і савецкіх органаў праяўлена недапушчальнае аслабленьне ўвагі да вылучэньня жанчын на кіруючую работу, замацаваньня іх на гэтай рабоце і практычнай дапамогі ў іх штодзённай працы. Гэта стварыла рэзкае зьніжэньне ліку жанчын на кіруючай рабоце, моманты зьняцьця вылучэнак з работы без папярэдняй згоды ўраду (з 2-х старшынь РВК зараз няма ні аднэй, з 72 старшынь сельскіх саветаў працуе 29).

Разглядаючы гэта, як яўна апартуністычную недаацэнку аднэй з важнейшых задач партыі па ўцягненьні працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За праяўленьне момантаў яўнага ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду аб замацаваньні і канкрэтнай дапамозе ў рабоце вылучэнак па Сіроцінскім і Бабруйскім раёнах (па Сіроцінскім раёне з 4 жанчын — старшынь сельсаветаў не засталося на працы ні аднэй, па Бабруйскім — зьнят з працы беспадстаўна апошні старшыня сельсавету — вылучэнка бяз згоды ўраду), папярэдзіць сакратароў райкомаў і старшынь РВК гэтых раёнаў і прапанаваць ім на працягу бліжэйшага месяца выправіць допушчаныя памылкі, заразжа заняцца пытаньнямі вылучэньня работніц і калгасьніц на кіруючую работу (старшыні сельсаветаў, калгасаў, сельспажыўтаварыстваў) і замацаваньня іх, дапамагаючы ў рабоце вылучэнак.

Аддзелу кадраў ЦК праверыць выкананьне на месцах райкомамі пастановы сакратарыяту ЦК ад 7-VIII аб вылучэньні жанчын старшынямі сельсаветаў і калгасаў.

2. Абавязаць фракцыю КП(б)Б прэзыдыуму ЦВК, Белкалгасцэнтр, Белкаапсаюз, Белпрамсаюз, ЦСПСБ і ўсе райкомы КП(б)Б у месячны тэрмін праверыць становішча вылучэньня працоўных жанчын на кіруючую савецкую, прафэсыянальную, гаспадарчую, калгасна-кааперацыйную работу ва ўсіх раёнах і цэнтральных установах, вызначыўшы канкрэтныя мерапрыемствы па рабоце з вылучэнкамі, аказаньні канкрэтнай дапамогі, паляпшэньні ўмоў працы і быту іх і асабліва вылучэньні новых кадраў з актыву работніц і калгасьніц.

3. У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня задач партыі і ўраду аб вылучэньні жанчын на кіруючую работу прапанаваць:

а) ЦВК правесьці куставыя курсы падрыхтоўкі жанчын старшынямі і сакратарамі саветаў у 1932 г. у палескіх і прымежных раёнах у колькасьці 100 чал. і ў 1933 г. правесьці цэнтральныя курсы падрыхтоўкі жанчын старшынямі сельсаветаў на 300 чал. і праз міжраённыя кустовыя курсы перападрыхтаваць па 200 чал.

РК і РВК загадзя, у кастрычніку па ўсіх раёнах склікаць раённыя нарады жанчын, абраных у саветы і замацаваных дэлегатак па пытаньнях правядзеньня загатовак і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў;

б) Калгасцэнтру на працягу лістапад-сьнежня правесьці кустовыя курсы падрыхтоўкі жанчын старшынямі калгасаў на 700 чал., папярэдне ў кастрычніку склікаць па ўсіх раёнах нарады калгасьніц—членаў праўленьня калгасаў і актыву па пытаньні размеркаваньня даходаў і арганізацыі жаночай працы ў калгасах;

в) Белкаапсаюзу ў сувязі з надыходзячымі перавыбарамі кааперацыйнай сыстэмы, забясьпечыць падваеньне колькасьці жанчын на кіруючай рабоце па ўсіх зьвеньнях кааперацыйнай сыстэмы і органаў грамадзкага харчаваньня, у прыватнасьці, вылучыць дадаткова ня менш 5 старшынь райспажыўсаюзаў, 200 старшынь сельспажыўтаварыстваў і 300 загадчыкаў крам. У сьнежні правесьці курсы падрыхтоўкі жанчын, працуючых на кіруючай рабоце ў органах кааперацыйнай сыстэмы ў колькасьці на 600 чал., правесьці папярэдне па ўсіх раёнах раённыя нарады жаночага і кааперацыйнага актыву па пытаньнях чарговых задач у рабоце кааперацыі;

г) пад адказнасьць сакратароў РК забясьпечыць якасны падбор курсаў, правільнае скарыстаньне і замацаваньне скончыўшых курсы работніц і сялянак на кіруючай рабоце ў адпаведных галінах савецкай, калгаснай і кааперацыйнай сыстэмы.

4. На чарговым пасяджэньні сакратарыяту ЦК заслухаць ЦСПСБ па пытаньнях работы саюзаў у галіне кваліфікацыі і вылучэньня работніц на прафсаюзную работу і ЦП саюзаў швэйнікаў і нархарч па пытаньнях вылучэньня работніц на гаспадарчую работу.

За 1.360 тыс. га азімых, 1.500 тыс. га зябліва

НЕ АДКЛАДВАЦЬ ЗЯБЛІВА ДА СКАНЧЭНЬНЯ СЯЎБЫ

ФАРСАВАЦЬ УБОРКУ БУЛЬБЫ, ВЫЗВАЛІЦЬ БУЛЬБЯНІШЧА ПАД ПАСЕЎ АЗІМЫХ

АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ—АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО

Па БССР ня вытрыманы тэрміны сяўбы азімых, яшчэ больш марудна разгортваецца зяблівае ворыва. Першая пяцідзёнка кастрычніка павінна стаць **рашаючай, ударнай** пяцідзёнкай па 100 проц. выкананьні плянаў сяўбы, па ўмацаваньні тэмпаў зябліва. Такую задачу паставіў ЦК КП(б)Б перад кожнай партарганізацыяй.

Многія, ня толькі партыйныя ячэйкі на месцах, але нават і раённыя камітэты партыі адстаючых раёнаў да сёньняшняга дня ніяк ня могуць зразумець, што посьпех правядзімых кампаній вырашаецца перш-на-перш правільнай арганізацыяй працы. Там, дзе забыта пастаянная калгасная брыгада, там, дзе яна не ўмацоўваецца, наглядаецца зацяжка сяўбы, марудна разгортваецца зябліва.

У пастановах партыі і ўраду ня раз падкрэсьлівалася, што трэба арганізаваць працу так, каб сама брыгада была зацікаўлена ў хутчэйшым скончэньні вызначаных ёй вытворчых заданьняў. Чым лепшая будзе якасьць работы, чым большы ўраджай атрымаецца з вучастку, тым больш даход будзе прыпадаць на працадзень. Іменна так трэба ставіць пытаньне.

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у пастанове ад 5 ліпеня напомнілі кожнай партарганізацыі што «**арганізацыя працы** ў калгасах павінна забясьпечыць яшчэ ў большай меры, чым гэта мела месца, непасрэдную зацікаўленасьць як кожнай брыгады, так і асобных калгасьнікаў у рэзультаце сваёй работы».

Толькі пры ўмовах штодзённых клопатаў па ўмацаваньні калгасных брыгад, пры ўмовах зьнішчэньня цякучасьці рабочай сілы палявых брыгад можна дасягнуць высокіх паказальнікаў у прадукцыйнасьці працы. Трэба, як правіла, абавязкова ўстанавіць прыёмку засяваемай плошчы, прыёмку зяблівага ворыва. У залежнасьці ад якасьці выкананай работы праўленьне калгасу абавязана для брыгадзіра і брыгады зьніжаць або павышаць ацэнку працадня (або колькасьць выпрацаваных працадзён) ад 10 да 20 проц. Устанавіўшы **адказнасьць брыгадзіра** ня толькі за колькасьць, але і за якасьць сяўбы і зябліва, мы зможам дабіцца павышэньня ўраджайнасьці.

Адным з асноўных рашаючых стымулаў у справе павышэньня прадукцыйнасьці калгаснай працы, пасьпяховага завяршэньня сяўбы і ўмацаваньня тэмпаў зябліва зьяўляецца правільная выдача авансаў у лік выпрацаваных працадзён, правільнае размеркаваньне даходаў.

Авансы павінны выдавацца выключна па колькасьці і якасьці работы кожнага калгасьніка. Усякі ўраўніцельны падыход, выдача па патрэбах толькі шкодзіць калгаснай вытворчасьці. Усялякае затрыманьне з размеркаваньнем натуральных даходаў спрыяе недысцыплінаванасьці калгасьнікаў, зьніжае прадукцыйнасьць працы ў брыгадах.

Ня рэдкі выпадкі, калі калгасы парашылі, выдаўшы авансы, пачакаць з астатнім размеркаваньнем натуральнай часткі даходу да новага году. Такая тэндэнцыя няправільная. У пастанове ЦК і СНК ад 5 ліпеня сказана: «**Пасьля скончэньня здачы прадукцыі паводле ўстаноўленага пляну дзяржаўных загатовак раньніх збожжавых культур і пасьля вызначэньня насенных фондаў бяз усякага затрыманьня, калгасьнікам павінна быць выдана праўленьнем калгасу ўся астатняя частка харчовага і кармовага збожжа, якое ім прылічваецца**».

Выканаўшы плян загатовак, стварыўшы насенныя фонды, калгас абавязан адразу астатнюю натуральную частку разьмеркаваць па працаднёх. Гэта будзе спрыяць умацаваньню працоўнай дысцыпліны. Гультай адразу ўбачыць, што для таго, каб атрымаць збожжа трэба аддана працаваць па выкананьні плянаў усіх асеньня-гаспадарчых кампаній, асабліва сяўбы і зябліва.

На сёньняшні дзень з сяўбой асабліва адстаюць МТС. Няправільная ацэнка працадня трактарыста часта стварала цякучасьць сярод гэтага асноўнага касьцяка кваліфікаваных калгасьнікаў, не давала магчымасьць поўнасьцю і рацыянальна скарыстаць увесь трактарны парк.

Сёньняшняя пастанова калегіі НКЗ СССР аб павялічэньні зьдзельных расцэнак работ трактарыста ў працаднёх на 50 проц. за ўвесь 1932 г. дае магчымасьць значна палепшыць матэр'яльна-бытавыя ўмовы трактарыста. Задача [illegible] ў тым, каб гэта пастанова была неадкладна выканана кожнай дырэкцыяй МТС, кожным праўленьнем калгасу.

Умацаваньнем пастаяннай вытворчай брыгады, правільнай выдачай авансаў партарганізацыі змогуць пераможна завяршыць сяўбу, выканаць плян зяблівага ворыва да 20 кастрычніка.

АБ РАЗЬЛІКАХ З ТРАКТАРЫСТАМІ МТС

Пастанова калегіі НКЗ СССР АД 27 верасьня 1932 году

У сувязі з тым, што дастасоўваемыя на МТС нормы аплаты працы трактарыстаў у працаднях нізкія і не забясьпечваюць выпрацоўкі добрасумленна працуючым трактарыстам такой-жа колькасьці працадзён, якую выпрацоўваюць другія кваліфікаваныя калгасьнікі, калегія Наркамзему СССР пастанаўляе:

1. Павялічыць на 50 проц. зьдзельныя расцэнкі ў працаднях на ўсе работы, якія праводзяцца трактарыстамі, устанавіўшы ўзамен сярэдняй расцэнкі ў 1 з пал. працадня за дзенную норму выпрацоўкі — 2,25 працадня.

2. У сувязі з гэтым павялічыць на 50 проц. агульную колькасьць працадзён, выпрацаваных кожным трактарыстам на трактары ў 1932 г. з моманту пачатку палявых работ.

3. Зыходзячы з новых расцэнак, выдаць усім трактарыстам дадаткова натуральныя авансы і грашовую аплату на ўсю колькасьць працадзён, налічаных кожнаму трактарысту ад пачатку палявых работ да моманту выдачы авансаў.

Наркамзем СССР ЯКАЎЛЕЎ.

Адвесьці пагрозу скарачэньня азімага кліну

КРЫЧАЎ. (Наш. спэц. кар.). Раён сыстэматычна адстае ў сяўбе азімых. За пяцідзёнку з 20 па 25 верасьня прырост складае ўсяго 4,9 проц. На 25 верасьня плян выканан толькі на 65,2 проц.

За ганебнае зацягваньне і ігнараваньне тэрмінаў сяўбы азімых, устаноўленых партыяй і ўрадам Крычаўскі раён «Зьвяздой» занесен на чорную дошку. Але, ня гледзячы на гэта, партыйныя арганізацыі раёну належнага зруху ў сяўбе не дабіліся і зараз. Сяўба па-ранейшаму зацягваецца.

У значнай ступені адставаньне з выкананьнем пасеўных плянаў залежыць ад таго, што плошча ў 3000 га, якая павінна быць засеяна азімымі, занята пад бульбай.

Зусім зразумела, што задача кіруючых арганізацый раёну ў тым, каб зараз-жа, адначасова з узмацненьнем сяўбы, максымальна фарсаваць уборку бульбы, дабіваючыся таго, каб у бліжэйшыя дні падрыхтаваць ня менш 3.000 га бульбянішча пад пасеў.

Аднак гэтага няма. Уборка бульбы ў раёне праходзіць яўна нездавальняюча. Урадавыя тэрміны скончэньня ўборкі фактычна сарваны. З належачых убраць 5.911 га, на 25 верасьня ўбрана толькі 1.279 га або 22 проц. пляну.

Асабліва дрэнна ідзе ўборка па Бацьвінаўскім сельсавеце, дзе з патрэбных убраць 710 га, убрана ўсяго 72 га. Касьцюшкаўскі сельсавет з 494 га, убраў толькі 17. Такое-ж становішча ў **Сакольніцкім** і ў **Паланіцкім** сельсаветах.

Побач з ганебна нізкімі тэмпамі ўборкі з першых дзён у раёне ігнаруецца цэнтральная задача — барацьба са стратамі. Ня гледзячы на тое, што якасьць уборкі дрэнная, пераворваньне бульбы ня робіцца. Шмат бульбы застаецца ў зямлі.. На бульбянішчах калгасаў Крычаўскага гарсавету аднаасобнікі зьбіраюць дзесяткі пудоў бульбы.

Зусім нездавальняючае становішча з сяўбой і ўборкай бульбы абавязвае партыйныя арганізацыі Крычаўшчыны неадкладна ўзмацніць апэрацыйнае кіраўніцтва ўборкай. Фарсаваньнем уборкі бульбы дабіцца поўнага выкананьня плянаў асеньняй сяўбы.

Барыс Райскі.

Дакуль-жа будуць стаяць трактары

ВУЗДА. Вузьдзенская МТС мае ўсе магчымасьці для таго, каб поўнасьцю закончыць сяўбу і разгарнуць зябліва. Яна мае 20 трактараў і значную частку с.-г. машын.

Аднак, дрэнная арганізацыя працы, няўмелае скарыстаньне трактараў і адсутнасьць масавай выхаваўчай работы сярод трактарыстаў тармозіць пасьпяховае разгортваньне сяўбы азімых. Тэрміны скончэньня сяўбы прайшлі, але плян сяўбы на 25 верасьня выканан толькі на 82 проц.

Прастоі трактараў і недагрузка — звычайнае зьявішча. На працягу доўгага часу стаяць 5 трактараў, якія патрабуюць нязначнага рамонту. Між тым, рамонт не праводзіцца.

Такім безгаспадарчым адносінам да выкарыстаньня трактарнага парку павінен быць палажан канец. На аснове поўнага выкарыстаньня трактараў, МТС павінна дабіцца стопроцантнага выкананьня сяўбы і пераключыць усю сваю цягавую сілу на зябліва.

БЕЛТА.

Адказ тав. Максіма Горкага на прывітаньні

ГОРКІ (спатканы бурнымі апладысмэнтамі, пераходзячымі ў авацыю).

— Таварышы, расказваць вам аб тым, як усё гэта мяне хвалюе, я, зразумела, ня буду. Я вельмі стары для таго, каб скромнічаць, але, вядома, я разумею, што мае заслугі пераацэнены вамі. **(Сьмех, апладысмэнты).** Няхай так, я прымаю вашу ацэнку як аванс, які павінен я адпрацаваць. І паколькі ў мяне яшчэ ёсьць сякія-такія сілы, буду старацца рабіць тое, што я рабіў, лепш, калі гэта мне ўдасца. Аб юбіляры сказана даволі, давайце пагаворым аб юбілеі.

Як вы думаеце, таварышы, ці магчыма дзе-небудзь у сьвеце такое шырокае ўшанаваньне грамадзкага работніка, як вось у нас, у Саюзе саветаў?

Немагчыма. Дазвольце мне з поўнай упэўненасьцю заявіць, што немагчыма. Храміна капіталістычнага грамадзтва развалілася, акустыка ў ёй дрэнная, рэзонанс — подлы. Там, за рубяжом, не карыстаюцца сымпатыямі буржуазіі тыя людзі, якія ўпэўнены, што буржуазія даўно ўжо зрабіла на зямлі сваю справу, служыць перашкодай на шляхох разьвіцьця культуры і што ёй пара адправіцца да прадзедаў сваіх. Там магчыма, што калі рабочыя-камуністы ўшаноўвалі-б аднаго са сваіх барацьбітоў, дзядулі — правадыры рабочых с.-д. забаранілі-б арміі сваёй прымаць удзел у акце ўшаноўваньня. Там нямецкія гітлераўцы і інш. цьвіль пры ўдзеле паліцыі зьбілі-б рабочых-камуністаў. Гэта важна.

Я, зразумела, ніколі не сумняваўся ў тым, што рабочая кляса ўмее цаніць заслугі любога са сваіх байцоў. Сёньня крыху павышана, мажорна ўзята. Нічога! Гэта вельмі павучальна. Не для мяне ўжо, таму што я чалавек не малады, гэта важна для маіх субратоў — маладых пісьменьнікаў. Я думаю, што маім сутаварышом — маладым пісьменьнікам, тым пісьменьнікам, якія яшчэ, можа быць, нічога не надрукавалі, але працуюць над рукапісамі, вось гэтыя адносіны рабочай клясы да літаратара трэба ведаць.

Гэтыя веды, нясумненна, павінны павысіць энэргію моладзі і наогул прымусіць яе сур'ёзна і сумленна працаваць, выхаваць у сабе пачуцьцё адказнасьці перад краінай за кожнае сваё слова, пачуцьцё адказнасьці за ўсё, што ў ёй робіцца, і за ўсё тое, што ў ёй дрэнна або нядобра робіцца. Дзейнічаюць людзі, якія ўжо ведаюць, як трэба дзейнічаць, каб атрымаўся добры рэзультат. Калі-ж рэзультат дрэнны, значыцца, дрэнна працавалі, значыць самі вінаваты ў тым, што дрэнна. Усё—вельмі проста. Яшчэ чаго-б я пажадаў моладзі—гэта веры, непахіснай веры ва ўсемагутнасьць розуму. Вось, таварышы, тая сіла, якая вас апранае, абувае, грэе, вось вера ў гэту сілу, вера ў яе здольнасьць да далейшага бязьмежнага разьвіцьця, вось гэта неабходна выхаваць у сабе і гэта можа быць выхавана толькі працай, толькі накапленьнем ведаў, аснова якіх—праца, толькі ясным уяўленьнем аб тым, што дано розуму чалавеку, чалавецтву.

Я заклікаю маладых паплечнікаў маіх вучыцца, як можна больш вучыцца, пазнаваць сваю краіну, ведаць добра, дзе, што ў ёй, у чым яна адчувае патрэбу, ведаць яе мінулае, сучаснае і будучае, каб мець уяўленьне аб тым, як і што трэба рабіць для будучага. Я думаю, ня дрэнны наказ: трэба вучыцца. Веды—якраз тая зброя, якой усім нам, і мне ў тым ліку, не хапае.

Ну, вось, я ўсё сказаў. Таварышы, дазвольце вас ад душы падзякаваць за гэты зусім нязвычайны падарунак... які вы мне зрабілі ў гэты дзень, і за тую энэргію, якую вы ўдыхнулі ў мяне. Няхай жыве партыя рабочай клясы, партыя бальшавікоў! Таварышы, надзвычайная сіла, разумная, непахісная сіла наша партыя!

Жадаю росту ёй. А вам—знайсьці хутчэйшыя, не зважаючы на труднасьці, шляхі ў яе. **(Авацыі).**

Мерапрыемствы па адзначэньні юбілею М. Горкага

Пастанова калегіі НКА ад 7-27 1932 году

У адзначэньне 40-гадовага юбілею грамадзка-палітычнай і літаратурнай дзейнасьці М. Горкага, калегія НКА БССР пастанавіла:

1. Надаць імя Максіма Горкага наступным установам:

1) 6-й віцебскай ФЗС, 2) Урэцкай ШКМ Слуцкага раёну, 3) 12-й менскай ФЗС (яўрэйскай), 4) літаратурнаму факультэту менскага БПІ, 5) магілеўскаму палітасьветнаму тэхнікуму, 6) віцебскай гарадзкой бібліятэцы.

2. Устанавіць з 1-га студзеня 1933 г. стыпэндыі імя М. Горкага — для кожнага ВНУ па аднэй стыпэндыі разьмерам у 250 руб. у месяц і для тэхнікумаў па аднэй стыпэндыі ў 150 руб. у месяц.

Нам. наркома асьветы—БЯЛУГА.

Сяўбу ня скончылі, зябліва не пачыналі

КЛІМАВІЧЫ. Лепшым доказам апартуністычных адносін з боку Клімавіцкай МТС можа служыць такі факт, што МТС на сёньняшні дзень зусім не прыступіла да зябліва.

Трактарны парк знаходзіцца ў безгаспадарчым становішчы. 11 трактараў больш месяца стаяць у рамонце. У сёмым вучастку з 6 трактараў працуе толькі два. Астатнія няспраўныя.

Нормы выпрацоўкі сыстэматычна ня выконваюцца. Замест выпрацоўкі ў зьмену 1,8 га адным трактарам, фактычна ўзорваецца 1,4 Працуюць трактары замест 20 гадзін у суткі толькі 12. Вытворчыя вучасткі МТС не ўкамплектаваны загадчыкамі.

Усё гэта прывяло да таго, што сяўба азімых зацягнулася. На 20 верасьня засеяна 88 проц. азімага кліну.

Культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых трактарыстаў не пастаўлена на належную вышыню. Спэцвопраткай трактарысты не забясьпечаны. Сталоўкі няма. Зарплата выдаецца несваячасова, са спазьненьнем на два месяцы.

За недапушчальныя адносіны да трактараў і за ігнараваньне зяблівай кампаніі апартуністы з МТС павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Сматрэнка.

Палепшыць работу Бялыніцкага ільназаводу

БЯЛЫНІЧЫ. Перад Бялыніцкім ільназаводам стаіць адна з галоўнейшых задач — перапрацаваць у 1932 годзе 1.200 тон ільна-трасты. Выкананьне гэтай задачы будзе залежыць ад таго, як дырэкцыя заводу здолее расставіць рабочую сілу, арганізаваць работу, рэалізаваць 6 умоў т. Сталіна.

З 6 верасьня завод працуе круглыя суткі ў тры зьмены.

З мэтай павышэньня нормы выпрацоўкі і якасьці прадукцыі, агульны сход рабочых пастанавіў перайсьці на прагрэсыўную зьдзельшчыну.

Але-ж ні ў якім разе нельга абыйсьці моўчкі тыя недахопы, якія ёсьць на заводзе.

Рухавік выкарыстоўваецца нерацыянальна. Ён разьлічан на 36 конскіх сіл. Для таго, каб прывесьці ў рух 2 варштаты і дынама-машыну трацяцца толькі 17-18 сіл. Такім чынам рухавік нагружан на 50 проц.

Нормы выпрацоўкі ня выконваюцца. Калі за 8-гадзіны рабочы дзень адна зьмена павінна выпрацаваць 147 кілё ільнавалакна, дык выпрацоўваюць у сярэднім ня больш 100 кілё.

Галоўная прычына невыкананьня нормы выпрацоўкі заключаецца ў тым, што чэшучы ланцуг прышоў у нягоднасьць. Ён ірвецца па 3-4 разы ў суткі. Для таго, каб ланцуг зьвязаць трэба спыняць рухавік. На рамонт трацяцца па 6-8 гадзін. Такое зьявішча бывае кожны дзень.

Усё гэта бязумоўна адбіваецца на якасьці прадукцыі. Як прыклад, чэшучы ланцуг нацягнуць моцна нельга, бо ён ірвецца, а калі нацягнуць слаба ён хістаецца ва ўсе бакі, чапляе і ірве ільнавалакно, пераганяючы яго ў кудзелю.

Пабудова сушыльні да сёньняшняга дня ня скончана, ня гледзячы на тое, што для яе заканчэньня ўсе матэр'ялы ёсьць. Гэта стварае пагрозу, што завод вымушан будзе спыніць работу з-за адсутнасьці сухой трасты.

Складамі завод таксама не забясьпечан. Ёсьць толькі адна павець, ёмкасьцю на 500 тон трасты. Такім чынам, загатоўленую трасту ў гэтым годзе прыйдзецца складваць у стагі над адкрытым небам.

На сёньняшні дзень у складзе ляжыць ільнавалакна і кудзелі больш 10 тон. На сваячасовую адпраўку яе дырэкцыя не зварачае ўвагі. Ільнавалакно і кудзеля значны час марынуюцца. Такое марнаваньне гатовай прадукцыі зьяўляецца яўна злачынным.

Культурна-масавая работа сярод рабочых зусім адсутнічае. Бытавыя ўмовы рабочых не пастаўлены на належную вышыню. На заводзе нават і сталоўкі няма. Рабочыя больш 3-х месяцаў не атрымліваюць зарплаты. Машыніст Севасьцянаў 3 месяцы не атрымлівае пайка.

Такія, з дазволу сказаць «клопаты» дырэкцыі аб культурна-бытавых умовах паслужылі прычынай для цякучасьці рабочай сілы. Рабочыя працуюць ня больш 3-4 месяцаў, а пасьля пакідаюць завод.

Перад Белільнасаюзам, райарганізацыямі і дырэкцыяй заводу стаіць неадкладная задача — стварыць усе неабходныя ўмовы для поўнага выкананьня заводам промфінпляну.

Багданаў.

А. СТЭЦКІ

Саракагодзьдзе літаратурнай дзейнасьці Максіма Горкага

(Даклад на ўрачыстым юбілейным сходзе 25 верасьня 1932 году ў дзяржаўным акадэмічным вялікім тэатры СССР)

— Таварышы, пачатак літаратурнай дзейнасьці **А. М. Горкага** — знамянальная дата; яна супадае з гадамі, калі рабочая кляса нашай краіны ўпяршыню выступае, як самастойная сіла, калі пачынаецца ўздым рабочага руху ў Расіі, калі закладваюцца першыя ячэйкі нашай партыі, калі пачынае сваю дзейнасьць У. І. Ленін. Гэта невыпадковае супадзеньне. Дзейнасьць Аляксея Максімавіча самым цесным чынам зьвязана з рэвалюцыйным рабочым рухам Расіі; дух рэвалюцыі знайшоў сваё выяўленьне ў цэлым радзе выдатных твораў А. М.

40 год дзейнасьці Горкага немагчыма ахарактарызаваць у нямногіх словах.

Гэта дзейнасьць ахапіла гістарычную паласу вялізарнага значэньня. Уздым рабочага руху 90-х гадоў, рэвалюцыя 1905 г., гады рэакцыі, імпэрыялістычная вайна, Кастрычніцкая рэвалюцыя, гады грамадзянскай вайны, сацыялістычнае будаўніцтва,— вось тая гістарычная паласа, у якой дзейнічаў і дзейнічае ў цяперашні час А. М. Горкі. За яго шырокімі плячыма стаіць цэлая гісторыя, і якая гісторыя! Тое пакаленьне, якое прадстаўляю я, выдавала, зьяўляючыся на сьвет, свой першы піск у той час, як А. М. Горкі ўжо гаварыў поўным голасам на ўсю тагачасную Расію.

Мне, таварышы, прыдзецца толькі мімаходам успомніць аб выдатным асабістым лёсе Горкага, які даволі добра ўсім вядомы. Наш вялікі пісьменьнік прайшоў вялікі жыцьцёвы шлях, ён хлябнуў горкі келіх у гады свайго дзяцінства і юнацтва, прайшоў шляхі бадзяньняў, вытрымаў на дне буржуазна-памешчыцкай Расіі ціск у сотні атмасфэр і, ня гледзячы на ўсё, загартаваны і ўпарты, выйшаў на шырокі шлях літаратурнай і грамадзкай дзейнасьці.

40 год таму назад, калі зьявіўся «Макар Чудра», у пашпарце Горкага стаяла: «Майстар малярнага цэху». Прайшло нямнога год і майстар малярнага цэху паказаў сябе вялікім майстрам мастацкага слова, якім мы яго сёньня з радасьцю вітаем.

Таварышы, няма магчымасьці таксама ахарактарызаваць цалкам сёньня мастацкую творчасьць Аляксея Максімавіча. Яна надзвычай шматгранная і рознастайная. Горкі пісаў і вялікія мастацкія эпапэі, і невялікія апавяданьні, і паэтычныя рэчы, і драмы. Таксама рознастайныя і матывы, якія А. М. Горкі распрацоўвае ў сваіх творах. Я сёньня спынюся **на галоўным, дамінуючым матыве яго твораў, які робіць Горкага вялікім пралетарскім мастаком,** на тым матыве, які дазволіў У. І. Леніну сказаць, што А. М. Горкі зьяўляецца вялізарнейшым аўтарытэтам у справе пралетарскага мастацтва, што ён **моцна зьвязаў сябе сваімі мастацкімі творамі з рабочым рухам Расіі і ўсяго сьвету.**

Горкі прышоў у літаратуру і грамадзкую дзейнасьць поўны нянавісьці да буржуазна-памешчыцкага ладу, які душыць і калечыць людзей, да абывацельскай тупасьці і кансэрватызму, пакорнасьці лёсу, што затрымліваюць барацьбу з ладам уціску і эксплёатацыі.

У сваіх мастацкіх творах Горкі гэты лад, лад гвалту і ўціску, зьнішчальна крытыкаваў, прычым ён зрабіў гэта, галоўным чынам, сродкамі мастацкай творчасьці.

Гэта тэма, якую ён распрацоўваў у сваіх мастацкіх творах, — тэма **выкрыцьця капіталізму,** яна, здавалася-б, ня новая ў расійскай літаратуры. Яна знайшла свой выраз у творах Талстога, якога Ленін цаніў за тое, што ён зрываў усе і ўсялякія маскі з буржуазна-памешчыцкага ладу. Горкі ўнёс аднак новае ў [illegible] тэму, ён паставіў яе па-свойму і абазначыў новую ступень разьвіцьця рускай літаратуры, яе паваротны пункт.

Калі ўзяць буйнейшыя творы Горкага і яго дробныя апавяданьні, дык у іх асноўным, дамінуючым матывам зьяўляецца паказ зьвярынай і жорсткай сілы капіталізму. Вазьмеце такія творы, як «Фома Гордеев», «Трое», «Дело Артамоновых», «Матвей Кожемякин» і рад іншых твораў; вы там убачыце, як Горкі агаляе гэту сілу, зрывае з яе ўсе і ўсялякія маскі, паказвае яе прыроду, яе сутнасьць: ашуканства і хлусьню, кроў і бруд капіталістычнага накапленьня, прыгнечаньне і эксплёатацыю, на якія яна апіраецца. Ён разам з тым выкрывае ў сваіх мастацкіх творах і тое, як гэта сіла душыць, калечыць чалавечую асобу, як яна гасіць свабодную мысьль і душыць усякі парыў да новага. «Вы ня жыцьцё будавалі, — выкрывае Фама Гардзееў буржуазію, — вы памыйную яму зрабілі! Бруд і духату разьвялі вы рукамі сваімі. Ці ёсьць у вас сумленьне? Ці памятаеце вы бога? Пятак — ваш бог! А сумленьне вы прагналі... Куды вы яго прагналі? Крывапіўцы. Чужой сілай жывяцё... чужымі рукамі працуеце! Колькі народу крывёю плакала ад вялікіх спраў вашых? І ў пекле вам, сволачам, месца няма па заслугах вашых... не ў агні, а ў гразі кіпучай варыць вас будуць. Вякамі не пазбудзецеся пакут»...

Горкі выкрывае капіталізм, як вялікі і яркі мастак, які ў поўнай меры ўладае сваім майстэрствам. Справа ў яго зусім ня зводзіцца да выкрываўчых прамоў, якія чуюцца ў тэй ці іншай форме на старонках яго твораў. Гэтыя творы — не публіцыстыка, а мастацтва. Там вы ня знойдзеце эканамічных трактатаў і формул дадатковай вартасьці. Горкі кляйміць капіталістаў, агаляе іх сутнасьць сваёй зброяй — сродкамі мастацкае творчасьці, сродкамі мастацкага слова. Гэта значна складаней і надае асаблівую сілу яго творам.

Энгельс пісаў наконт Бальзака, што ён лічыць яго вялізарнейшым мастаком-рэалістам, што ён ставіць яго значна вышэй Заля, галоўным чынам, таму, што Бальзак ня скочваецца да голай публіцыстыкі, да гісторыі, а заўсёды застаецца на сваіх пазыцыях мастака; што ён разам з тым з такой сілай, з такой яркасьцю паказвае гісторыю францускага грамадзтва, што чытаньне Бальзака дало яму, Энгельсу, больш, чым дзесяткі іншых эканамічных, гістарычных і статыстычных работ.

Усё гэта мерка, якую ўжываў Энгельс да Бальзака, прыстасоўна таксама і да твораў Аляксея Максімавіча. Горкі дзейнічае выяўленчымі сродкамі мастацтва. Ён даводзіць гэтыя малюнкі, якія прадстаўляюць капіталізм, малюнкі купцоў і фабрыкантаў да такой сілы, што яны ўстаюць перад вачыма з усёй датыкальнасьцю ў сваіх наглядна-адчувальных рысах. Недарма мільянэр, волжскі купец Бугроў дапытваўся ў свой час у Аляксея Максімавіча, з каго ён сьпісаў купца Маякіна. Бугроў лічыў, што такі купец павінен быў абавязкова дзесьці існаваць. Зразумела, А. М. Горкі купца Маякіна ня сьпісаў, не сфатаграфаваў, але на аснове сваіх назіраньняў, на аснове свайго жыцьцёвага вопыту ён стварыў гэты вобраз, прычым гэты вобраз адзначаецца такой дзіўнай сілай і такой праўдзівасьцю, што вы, чытаючы гэты твор, павінны сказаць, што такі чалавек абавязкова быў, што ён існаваў. А разам з тым, за гэтай адчувальнай датыкальнасьцю, пры якой кожны вобраз прадстае ў сваёй рэальнасьці, у сваёй індывідуальнасьці, — вы бачыце ў гэтых фігурах вялікую сілу мастацкага **абагуленьня.** За ўсімі гэтымі Шчуравымі, Артамонавымі, Маякінымі адчуваюцца Марозавы, Бугровы, Мамантавы, дзесяткі і сотні айчынных капіталістаў і капіталістаў, якіх Аляксей Максімавіч наглядаў і вобразы якіх ён даў у сваіх творах.

Вобразы гэтыя прабуджаюць цэлы рад аналёгій, цэлы рад мысьляй. Вазьмеце вы купца Шчурава з «Фомы Гордеева». Гэта —волжскі краж, які вырас дзесьці на берагох Волгі, на крыві і брудзе. Калі А. М. адчыняе перад намі дзьверы яго каморкі ў гасьцініцы, то адчуваецца пах, які ідзе адтуль. А разам з тым, калі вы ўбачыце перад сабой фігуру гэтага купца, успамінаюцца бліскучыя старонкі «Капіталу», дзе апісваецца працэс капіталістычнага накапленьня. Гэта фігура купца, які гаворыць аб бажэственым, фігура старавера, які падтрымлівае нейкія скіты і разам з тым гатоў кожнаму, хто стане ў яго на дарозе, зламаць хрыбет, — хіба-ж яна не нагадвае тую характарыстыку капіталістычнага накапленьня, якая дана ў Маркса і якая выказана не ў мастацкіх вобразах, а ў формулах жалезнай марксавай лёгікі. Хіба-ж не нагадвае гэта фігура тую характарыстыку капіталу, якую Маркс падае ў сваім вялікім творы: «Раз ёсьць у наяўнасьці выстарчальны прыбытак, капітал становіцца сьмелым. Забясьпечце 10 проц. — капітал згодзен на ўсякі ужытак. Пры 20 проц. ён становіцца ажыўленым, пры 50 проц. ён сапраўды гатоў зламаць сабе галаву, пры 100 проц. ён топча нагамі ўсе людзкія законы, пры 300 проц. няма такога злачынства, на якое ён не рызыкнуў-бы, хоць-бы пад страхам шыбеніцы!». Тое, што выказана ў Маркса ў жалезных законах лёгікі, знайшло сваё мастацкае ўвасабленьне ў мастацкіх творах Аляксея Максімавіча.

Які-небудзь прыдзірлівы крытык, чытаючы «Дело Артамоновых» скажа: «Ну, што-ж гэта за твор, тут-жа фабрыка недзе на заднім пляне, тут ня відаць эксплёатацыі на гэтай фабрыцы».

Сапраўды, сіла капіталістычнага накапленьня, сіла драпежнікаў даецца Горкім не ў разрэзе эканамічнага дасьледу. Аўтар ня ўводзіць нас проста на фабрыку, але ён ў той-жа час паказвае, як расьце і на чым расьце гэта «Дело Артамоновых», вы адчуваеце, як яно падобна да спрута ахапляе і смокча рабочы люд. Радам яркіх і мастацкіх штрыхоў дае ўзаемаадносіны паміж капіталістамі — Артамонавымі і паміж рабочымі, прычым гэтыя штрыхі надзвычай маляўнічы, бо яны паказваюць супярэчнасьці паміж рабочай клясай і капіталістамі, іх узаемаадносіны і барацьбу на розных гістарычных ступенях. Там не разгортваецца перад вамі непасрэдна тэорыя крушэньня капіталізму, але вы ў той-жа час бачыце і адчуваеце па ходу ўсяго твору, што «справа» ідзе да канца, і калі Ціхан гаворыць старому Артамонаву: «Гэта супроць цябе вайна, Пятро Рыгорыч!», дык гэта «супроць цябе вайна» насоўваецца з усёй немінучасьцю лёсу на працягу ўсяго мастацкага твору.

Ёсьць у нас крытыкі і крытычныя тэорыі, якія імкнуліся даць некалькі іншае асьвятленьне значэньню твораў М. Горкага. Але гэта фальшывыя тэорыі.

Ёсьць тэорыя, па якой пісьменьнік ніяк ня можа выйсьці за межы сваёй уласнай клясы і даць вобразы другой клясы і што пісьменьнік у кожным творы абавязкова мае свой цэнтральны, стрыжнявы вобраз, які адлюстроўвае тое, што ён хоча сказаць і які характарызуе яго клясавую прыроду.

Творчасьць Горкага ясьней ясьнага паказвае няґрунтоўнасьць гэтай тэорыі. Бо Горкі з усёй сілай мастака, усімі выяўленчымі сродкамі дае аднолькава яркія фігуры рабочых, напрыкл., Паўла, хахла, Пелагеі Нілаўны, якая зьяўляецца незабыўнай, адной з лепшых фігур Аляксея Максімавіча, і, разам з тым,— яркія фігуры купцоў і абывацеляў. Гэтая тэорыя — глупства і суцэльная фальш: яна закрывае шляхі да пазнаньня мастацкага твору, да яго разуменьня, яна прыводзіць да зусім няверных ацэнак мастацкіх твораў. Важна ідэя ўсяго мастацкага твору, важны яго эфэкт, яго сэнс, яго зьмест, важна тое, як ён уплывае на чытача. І ў гэтых адносінах эфэкт і ўплыў твораў Горкага можна ахарактарызаваць тым, што гэтыя творы мабілізуюць чытача супроць усяго кансэрватыўнага, застылага, рабскага, супроць усяго прытупляючага і атупляючага чалавечую асобу, мабілізуюць супроць уціску і эксплёатацыі, на барацьбу за сацыялізм. «Трэба вожыка пусьціць пад чэрап чалавеку, каб ён ніколі не супакойваўся», — так гаворыць адзін з пэрсанажаў Горкага. І такога вожыка пад чэрап А. М. Горкі запускае кожным сваім творам.

А.М. Горкі па-майстэрску малюе псыхалёгію людзей. Але ён не займаецца вывучэньнем і паказам усіх самых тонкіх ніцяй і пераліваў псыхалёгічных перажываньняў, як чагосьці самастойнага, — так сказаць, з замілаваньня да мастацтва. Ён не разглядае псыхалёгічнае жыцьцё як нейкае замкнутае кола, як нейкае кола, адарванае ад усяго жыцьця. Не. А. М. Горкі разглядае, бярэ і паказвае **псыхалёгію чалавека ў сувязі з сацыяльнымі ўмовамі.** Некаторыя з яго твораў маюць характар вялікіх мастацкіх біяграфій. Ён бярэ чалавека з самых першых дзён, вядзе яго праз усе пэрыпэтыі жыцьцёвага шляху і паказвае, як асяродзішча, абставіны, перашкоды і падзеі гэтага жыцьцёвага шляху фармуюць чалавечую псыхалёгію. У гэтых адносінах Горкі дасягае вялізарнага майстэрства. Вазьмеце вы такія рэчы, як «Матвей Кожемякин», «Фома Гордеев» и «Жизнь Клима Самгина». Вы літаральна тут адчуваеце старонка за старонкай, як перад вамі **фармуецца чалавечая асоба.** Гэтае вялікае майстэрства таму, што тут, паказваючы **матэрыялістычна** псыхалёгію чалавека, А. М. Горкі ўмее праз індывідуальныя лёсы паказаць жыцьцё сацыяльнага цэлага, зусім не спаўзаючы на пазыцыі публіцыста ці гісторыка. Ён застаецца на сваіх пазыцыях мастака. Гэтаму вялізарнаму майстэрству павінны **вучыцца і вучыцца нашы пісьменьнікі ў А. М. Горкага.**

Горкі — майстар **вялікіх мастацкіх абагульненьняў.** Здавалася-б, ён паказвае нейкіх купцоў, волжскіх фабрыкантаў, часамі дзівакоў, часамі страшных у сваёй зьвярынай сіле драпежнікаў. Але А. М. Горкі заўсёды паказвае іх з пункту гледжаньня **самай рэвалюцыйнай клясы.** Ён стаіць на пазыцыях пралетарыяту, для якога гэтыя Маякіны, Артамонавы і інш. стваралі **нечалавечыя ўмовы існаваньня.** Іменна таму, **адсюль,** паказваючы ўвесь стары лад, усе пласты грамадзтва, А. М. Горкі — набывае сілу, якая не даецца **ніякаму мастаку другой клясы.** Іменна з пазыцый рэвалюцыйнай клясы Горкі зрывае ўсе і ўсялякія маскі, пакрывалы двуліцасьці, ханжаства, культурнага бляску, паказнога чалавекалюбства, што надзявалі, накідвалі на сябе яго героі. Ён умее паказаць іх ва ўсёй аголенасьці, умее паказаць іх сапраўдную прыроду капіталістычных драпежнікаў. Дзякуючы гэтаму яго мастацкія творы маюць характар вялікіх абагульненьняў.

Гэта ня толькі датычыць яго вялікіх твораў. Вазьмеце вы такое яго апавяданьне, як «Кирилка» Здавалася-б, невялікі нарыс аб эпізодзе, які адбыўся ля пераправы. А між тым у гэтым невялікім нарысе дана багатая гама сацыяльных адносін, падхоплены і паказаны некаторыя вернейшыя рысы псыхалёгіі селяніна. Гэта робіць «Кирилку» адным з лепшых твораў Аляксея Максімавіча.

А «Городок Окуров»! Хто да Аляксея Максімавіча з такой патрасаючай сілай мог паказаць зьвярыны быт акураўскай Расіі, на які іншыя мастакі накідвалі ідылічныя пакрывалы дзівацкай і прастадушнай Русі! Аляксей Максімавіч паказаў дрыгву зьвярынага быту гэтай Расіі, якая засмоктвала ўсё, што туды трапляла. Гэта мог зрабіць з такой сілай, з такой ґрунтоўнасьцю толькі мастак пралетарыяту. І недарма гарадок Акураў стаў нарыцальным імем для ўсёй мяшчанскай павятовай Расіі! Паказваючы без падфарбоўваньня, не зьмякчаючы праўды жыцьця, цяжкі быт акураўцаў, кроў і гразь артамонаўскіх спраў, Аляксей Максімавіч разам з тым ніколі не навявае журбы. Ён малюе часамі патрасаючыя карціны жыцьця з усім іх жахам, з усёй іх крывёю і брудам. Але ён-жа кліча на шлях рэвалюцыйнага сацыялістычнага абнаўленьня жыцьця.

Некаторых нэрвовых чытачоў творы Аляксея Максімавіча прыводзілі ў жах, а буржуазныя крытыкі пісалі аб тым, што творы Горкага нельга дапускаць ні ў публічныя, ні ў сямейныя бібліятэкі. Былі філістэры, якія дзівіліся з таго, якім чынам Горкі атрымаў папулярнасьць, бо — падумайце! — ён на кожнай старонцы сваіх твораў выклікае да парушэньня законаў — боскіх і людзкіх. Апошняе верна, бо Горкі прадстаўляе якраз тую клясу, якая прыйшла для таго, каб разбурыць старыя законы жыцьця і ўстанавіць новыя.

Але, паўтараю, Аляксей Максімавіч ніколі не навявае журбы. Ён ня быў зломлен у жыцьцёвым змаганьні. Ён прышоў у грамадзкае жыцьцё і літаратуру для таго, каб сказаць горкую праўду аб жыцьці і заявіць супроць рабскіх умоў жыцьця **свой палкі пратэст,** які рвецца са старонак кожнай кнігі. Гэты палкі пратэст, гэты кліч да барацьбы адрозьнівае яго ад іншых вялікіх мастакоў.

Талстой, які зрываў усе і ўсялякія маскі з буржуазна-памешчыцкага ладу, які выкрываў дваранства, чыноўную бюракратыю, капіталізм, разам з тым вёў «юродивую» прапаведзь непраціўленства, разам з тым клікаў з вялікага гістарычнага шляху пад цень рэакцыйнай утопіі.

Чэхаў афарбаваў свае бліскучыя творы пэсымізмам, журбой, сумнай марай, што, магчыма, праз 100-200 год чалавеку будзе лепш.

Горкі прышоў у літаратуру **як баец. Ён у кожны свой твор укладвае ўвесь свой баявы тэмпэрамант, як ніхто іншы.**

Адзін з крытыкаў 900-х гадоў дапытваўся, што гэта за дзіўная паэзія ў Горкага? — нейкае пустое неба, нейкія птушкі - буравесьнікі і сокалы, чаму яны б'юцца? Што гэта за дзіўныя матывы? Хіба-ж ня лепш ранейшы стары матыў: «по небу полуночи ангел летел и тихую песню он пел». Гэта пісалася тады ўсур'ёз. Гэты мудры крытык ня ўлічваў аднэй маленькай акалічнасьці, ня ўлічваў таго, што ў краіне пачыналася рэвалюцыйнае хваляваньне, што парывы рэвалюцыі вымяталі ўсіх анёлаў і чарцей і з паэзіі. Краіна патрабавала новых песень. Іх сьпяваў Горкі, і песьня «О буревестнике» падхоплена была ўсёй рэвалюцыйнай Расіяй, а Уладзімер Ільліч Ленін адзін са сваіх артыкулаў, прысьвечаных рэвалюцыі, упрыгожыў вобразам «Буревестника» і закончыў яго словамі: «Пусть сильнее грянет буря».

Ніхто лепш самога Горкага ня выказаў яго падыходу да творчасьці, яго погляду на задачы мастацкай творчасьці. У адным са сваіх лістоў Валерыю Брусаву ён пісаў наконт мабілізацыі студэнтаў у Кіеве: «Настрой у мяне, як у злога сабакі, зьбітага, узятага на ланцуг. Калі вы, судар, любіце чалавека, вы мяне, трэба думаць, зразумееце. Я, бачыце, адчуваю, што аддаваць студэнтаў у салдаты — подласьць, наглае злачынства супроць свабоды, асобы, ідыёцкая мера абажраных уладай прахвостаў. У мяне кіпіць сэрца, і я быў-бы рад плюнуць ім у нахабныя морды чалавека-ненавісьнікаў, якія будуць чытаць вашы «Северныя цветы» і іх пахвальваць, як і мяне хваляць. Гэта абураюча і агідна да няімоўнай злосьці на ўсё, нават на Буніна, якога люблю, **але не разумею, як талент свой, дасканалы, як матавае срэбра, ён не адточыць як нож і ня ткне ім, куды трэба».**

Вось як Горкі глядзеў на сваю творчасьць. Некаторыя запытаюць: што гэта за дзіўны погляд на мастацкія творы? Што за тэндэнцыйнасьць? Дазвольце мне, таварышы, у адказ на гэта выклікаць на момант адзін вялікі цень паэта іншых часоў — цень Дантэ. Праўда, мне можа папасьці за гэта ад некаторых суровых крытыкаў, бо ў Дантэ гутарка ідзе аб такіх даўно вышаўшых з нашага ўжытку рэчах, як «Божественная комедия» — пекла, рай, чысьцілішча. Але Дантэ зьяўляецца аднэй з найвышэйшых вяршалін мастацтва. А разам з тым гэты твор наскрозь прапітан палітычным запалам, які знайшоў свой выраз у асаблівым мастацкім пляне. Дантэ ўсіх сваіх палітычных ворагаў і ворагаў сваёй роднай Флёрэнцыі рассадзіў па кругох пекла, вынайшаў для іх усялякія пакуты. Аднаму з іх, папе Міколаю III, ён выдумаў асаблівую горкую і ганебную пакуту: пасадзіў яго ў агністую магілу галавой уніз і пяткамі ўверх. Ня дрэннае месца для пап!

Дантэ з пагардай адносіўся да таго роду людзей, якія ні цяплы, ні халодны, якія ня любяць і не ненавідзяць, і прымусіў іх цені кружыцца, падобна да лістоў, гнаных ветрам у пахмурным праддзьвер'і пекла.

Хіба-ж не закляйміў і гэты род людзей і А. М. Горкі ў сваіх творах? Хіба-ж ня закляйміў ён іх у сваёй апошняй вялікай мастацкай эпапэі «Клим Самгин»? Бо А. М. Горкі, як і вялікі флёрэнтыйскі паэт, зьяўляецца перш за ўсё **пісьменьнікам байцом.**

З таго часу, як А. М. Горкі пісаў свой ліст, мінула шмат год. З таго часу многае зьмянілася. Матавае срэбра бунінскага таленту, зношанае і пацёртае, упрыгожвае вэртэп эміграцыі. А Горкі, які ператварыў свой талент у блісчасты клінок і накіраваў яго ў сэрца буржуазна-памешчыцкага ладу, стаў аднэй з сусьветных велічынь і ўлюбёным пісьменьнікам мільёнаў. **(Аплёдысмэнты).**

Свой гарачы пратэст супроць рабскіх умоў жыцьця А. М. Горкі выказаў спачатку ў рамантычнай форме, вывёўшы фігуры басякоў. Няпраўда, што ён у той час быў ніцшэанцам, што гэтыя фігуры зьяўляюцца нейкімі расійскімі ніцшэанцамі. Нічога падобнага. Гэта былі мастацкія формулы, у якіх А. М. Горкі выказваў пратэст супроць усяго, што давіць і крывіць чалавечую асобу, пратэст супроць усяго, што яе абезасабляе. Але, зразумела, гэтыя фігуры ніяк не маглі быць пунктамі апоры для таго, каб зьмяніць стары лад жыцьця і па меры таго, як разгортваецца рабочы рух, як А. М. Горкі цесна зьвязваецца з гэтым рухам, зьяўляюцца іншыя фігуры, новыя дзейныя асобы ў творах Горкага, якія паказваюць, як трэба зьмяніць парадак жыцьця: зьяўляюцца фігуры рэвалюцыйных пралетараў, зьяўляюцца рэвалюцыянэры-інтэлігенты, якія арганізавана змагаюцца за тое, каб зьмяніць рабскі парадак жыцьця. Гэтыя фігуры, якія клічуць на шлях барацьбы, на шлях зьмены існуючага грамадзкага парадку, ёсьць ужо ў раньніх творах Аляксея Максімавіча. Яны дадзены ў «Фоме Гордееве» і ў аповесьці «Трое», у далейшым у п'есе «Враги» і асабліва ў аповесьці «Мать» і інш. творах.

У аповесьці «Мать» Горкі дае дасканалае палатно пралетарска-рэвалюцыйнай барацьбы, гэтай аповесьцю ён кліча на новы шлях. Зьяўленьне гэтай аповесьці выклікала жорсткія нападкі на Горкага ня толькі з боку буржуазных пісьменьнікаў, якія ня раз і да таго заўлялі аб канцы Горкага, — яна выклікала нападкі і з боку сацыял-дэмакратаў, з боку меншавікоў, з боку Плеханава. І толькі Ленін правільна і трапна з самага пачатку ацаніў гэтую аповесьць. Ён заявіў, што яна зьяўляецца адным з лепшых твораў Горкага. І сапраўды, мы бачым, як у «Мать» мастацка і поўна разгортваецца малюнак арганізаванай палітычнай барацьбы рабочых. Мы бачым тут упяршыню ў мастацкай літаратуры вобразы рабочых-бальшавікоў. Мы бачым дасканалы вобраз мацяры, у якім Горкі паказаў усю сілу ідэі сацыялізму. Горкі дасканалымі мастацкімі штрыхамі паказаў, як прабуджаецца сьвядомасьць гэтай цёмнай і забітай жанчыны, як ідзе ў яе барацьба старых традыцый, звычак, старых мысьляй, і як яны ўступаюць сіле новых ідэй, ідэй сацыялізму. Горкі паказвае з усёй сілай і з усёй перакананасьцю, як гэта цёмная і забітая жанчына ператвараецца паступова ў рэвалюцыйнага змагара за сацыялізм. Вобраз Пелагеі Нілаўны зьяўляецца адным з лепшых вобразаў Горкага, а яго твор «Мать» зьяўляецца лепшым творам з таго, што дала пралетарская рэвалюцыя да гэтага часу ў гэтым пляне.

Чым больш Аляксей Максімавіч зьвязваецца з рабочым рухам, тым больш ярка зьяўляецца асноўная рыса яго творчасьці — **рэалізм.** Горкі ня зьбірае дробязяй, не накапляе дэталі **дзеля іх саміх.** Не, ён праўду жыцьця прапускае праз сваю мастацкую лябараторыю, ён дае ў сваіх творах **тыповыя характары і ў тыповых абставінах.** Тое азначэньне, якое Энгельс даў Бальзаку, падыходзіць і да Горкага. І пра яго таксама можна сказаць, што многія яго творы даюць больш для разуменьня нашай эпохі, чым дзесяткі некаторых эканамічных і гістарычных работ, чым іншая статыстыка.

Але творчасьць Горкага — рэалізм **рэвалюцыйны.** Ён не зьяўляецца проста бытапісьменьнікам, як аб ім некаторыя гавараць. Ён ня проста фіксуе быт. Для яго ён ненавісны, — гэты нярухомы, мяртвяшчы быт, які перашкаджае руху наперад, які абблытвае чалавечую асобу. Горкі кліча да зьмены быту, да зьмены ўмоў жыцьця. Ён кліча на барацьбу супроць ладу рабства і прыгнечаньня. І вось гэты заклік уперад, гэта імклівасьць, якую мы бачым у кожным творы А. М. Горкага, гэта і характарызуе Горкага, як рэвалюцыйнага рэаліста, як мастака, які ня толькі малюе перад намі сапраўднасьць, але і кліча **наперад, да рэвалюцыйнага вырашэньня яе супярэчнасьцяй.**

Творчасьць Горкага — глыбока нацыянальная. Калі чытаеш яго творы, то адчуваеш, што яны разыгрываюцца тут, на гэтай раўніне, дзе адбываліся вялікія падзеі нашай гісторыі. Ён паказвае рускіх людзей розных клясаў і станаў з усімі іх дадатнасьцямі і хібамі. У яго творах блішчаць шырокія прасторы Волгі, са старонак яго кніг льлецца руская песьня. Іменна льлецца, бо А. М. Горкі любіць песьню і сам быў не ад таго, каб пасьпяваць. І таму, калі вы чытаеце яго кнігі, то вы гэту песьню **чуеце.**

Ніхто, як ён зараз не ўладае надзвычайным багацьцем расійскай мовы. І разам з тым творчасьць Горкага глыбока інтэрнацыянальная. **Горкага любяць, ведаюць, чытаюць, пралетары далёка за межамі нашай краіны.** Яго творы і там пашыраюцца ў сотнях тысяч экзэмпляраў. Бо пралетары бачаць за гэтымі фігурамі волжскіх купцоў і фабрыкантаў тую-ж сілу, якая душыць і прыгнятае іх у сваёй краіне. Бо ў вобразах Пелагеі Нілаўны і Паўла яны пазнаюць сваё цела і кроў, свае мысьлі і імкненьні. Яны бачаць перад сабой страшнае дно капіталістычнага грамадзтва, якое з такой патрасаючай сілай паказаў А. М. Горкі, куды скідваюцца абломкі людзкіх жыцьцяў, размолатых капіталізмам — абломкі вельмі шматлікія цяпер, у эпоху крызісу. Яны падхапляюць кліч барацьбы за сацыялізм, які чуецца са старонак горкаўскіх кніг. І таму яны кажуць разам з намі: **«Наш Горкі, наш!»**

Ул. І. Ленін адносіўся з вялікай цеплатой да А. М. Горкага. Ён заўсёды ўважліва сачыў за яго работай. У лістох ён спраўляўся аб яго здароўі, аб тым, як ідуць яго літаратурныя работы. Ён дапамагаў Горкаму сваімі парадамі. Гэтыя адносіны Уладзімера Ільліча да А. М. Горкага былі прасякнуты вялікай прыязьню. І разам з тым, У. І. першы ацаніў Горкага, як вялікага пралетарскага пісьменьніка. У процівагу меншавіком, у процівагу Троцкаму, Уладзімер Ільліч першы заявіў наконт таго, што Горкі **зьяўляецца вялізарнейшым аўтарытэтам у галіне пралетарскага мастацтва.**

Леніна няма. Няма Леніна, якому А. М. Горкі прысьвяціў свае прыгожыя старонкі. Але жыва наша партыя, жыва справа Леніна, людзі, якіх ён вырасьціў. І ня дзіва, што цяпер імя вялікага пралетарскага пісьменьніка А. М. Горкага сплятаецца з імем т. Сталіна, правадыра пралетарскай рэвалюцыі, у якім увасабляецца ўсё лепшае, што ёсьць у нас у партыі. **(Бурныя аплёдысмэнты).**

Горкі заўсёды выклікаў злобныя нападкі ворагаў. Яны не маглі і ня могуць спакойна яго зносіць. Яны прабавалі яго замоўчваць, а ён гаварыў так, што яго ўсе чулі. Яны абвясьцілі аб канцы Горкага, як мастака, а ён адказваў новымі і новымі дасканалымі творамі мастацтва. І цяпер, калі Горкі знаходзіцца тут, сабакі эміграцыі брэшуць і далей па яго адрасе. Няхай сабе! Горкі акружан замілаваньнем і пашанай мільёнаў у нашай краіне і за яе межамі.

Гэта замілаваньне — яму моцны шчыт, якога не праб'юць ніколі атручаныя стрэлы нянавісьці яго і нашых ворагаў. **(Аплёдысмэнты).**

Мне ўспамінаецца зараз адна з прыгожых легенд раньняга Горкага — яго легенда аб Данко. Людзі шукалі шлях з цемры і гібелі да новага жыцьця; яны блукалі. І вось юнак Данко, сэрца якога гарэла любасьцю да людзей, парашыў ім дапамагчы. Ён вырваў сваё сэрца, поўнае любасьці, падняў яго высока над галавой і яно зазьзяла ярка, як сонца, і асьвятліла людзям шлях. Так Горкі! Яго творы, у якія ён уклажыў усю кроў свайго сэрца, усю нянавісьць да прыгнятальнікаў, усё замілаваньне і вернасьць да прыгнечаных, яны зьзяюць яркім і непагасным сьвятлом, асьвятляюць жыцьцёвы шлях, клічуць да новага ладу, клічуць да барацьбы за сацыялізм.

А. М. Горкі жыве, працуе і змагаецца разам з намі. Ён прымае ўдзел у нашай агульнай рабоце за камунізм. Яго творчасьць надзвычай рознастайная: ён працягвае сваю мастацкую творчасьць, ён выступае і з публіцыстычнымі артыкуламі, ён праявіў свой пачын у такіх буйных рэчах, як «История заводов» і «История гражданской войны». Ніяк нельга забыць і таго прыгожага пачыну, які А. М. Горкі разам з Рамэн Ралянам, Драйзэрам і Анры Барбюсам, якога мы з радасьцю вітаем на нашым сёньняшнім сходзе **(бурныя аплёдысмэнты),** праявіў па склікаваньні антываеннага кангрэсу і аб'яднаньні сіл лепшай часткі інтэлігенцыі ўсіх краін і рабочае клясы ў мэтах барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны.

Мы ад усяго сэрца жадаем А. М. працягу гэтай прыгожай, самаадданай і поўнай энэргіі дзейнасьці.

Дазвольце выказаць пажаданьне і ўпэўненасьць, што А. М. Горкі, які сьвеж, бадзёр, малады душой, як другая пяцігодка **(бурныя аплёдысмэнты, якія пераходзяць у авацыю),** убачыць нашу краіну вызваленай ад апошніх рэштак акураўскай нечысьці, у поўным росквіце сацыялістычнай культуры, для якой ён працуе не пакладаючы рук, убачыць гэта наш дарагі і любы А. М. Горкі. **(Бурныя аплёдысмэнты).**

ІГНАРУЮЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ

(Ліст члена ІТР)

Партыяй і ўрадам вынесены пастановы аб паляпшэньні матэр'яльна-бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў, стварэньні спрыяючых умоў для разгортваньня іх творчай ініцыятывы. **Гэтыя пастановы ў Дрысенскім раёне ігнаруюцца.**

На працягу году мы дабіваемся атрымаць ня належачага нам пайку. Зварочваліся куды толькі можна: у прэзыдыум РВК, райснаб, РКК-РСІ, райспажыўсаюз і г. д., але нідзе не атрымалі дапамогі. Прыходзіцца задавальняцца абяцанкамі.

Прычынай гэтаму зьяўляецца **сваявольле і самазабесьпячэньне, якія пануюць у органах каапэрацыі Дрысенскага раёну.** Тут нормы выдачы прадуктаў па катэгорыях ня прытрымліваюцца. Адзін месяц прадукты выдаюцца па адных нормах, а ў другім—зусім па іншых.

У сьпіс раённых адказных работнікаў—«дваццатку» нейкім чынам занесены старшыня гарадзкога спажыўтаварыства, члены праўленьня райспажыўсаюзу, загадчык шавецкай майстэрні, загадчык млыну і рад іншых, якія ні ў якім разе ня могуць быць аднесены да гэтай катэгорыі. Як бачым, сьпіс «дваццаткі» машэньнікі скарыстоўваюць для самазабесьпячэньня.

У Дрысе даходзяць нават да таго, што адным выдаюць у некалькі раз павялічаную норму, а другім настолькі-ж паменшаную, а то і зусім не даюць.

Нядаўна была праведзена чыстка катэгорый «дваццаткі», але вынікі чысткі паказваюць вельмі сумны малюнак. Каапэратары зноў-такі засталіся ў гэтай «дваццатцы і далей твораць свае агідныя справы.

Электрастанцыя таксама не адстае ў справе недаацэнкі ІТР. У пачатку верасьня значна скарацілася падача электраэнэргіі. Тады электрастанцыя ў першую чаргу выключае сьвятло з кватэр спэцыялістаў і пакідае сьвятло ў саматужнікаў і інш. людзей. Прыкладаў ігнараваньня спэцыялістаў у Дрысенскім раёне можна прывесьці шмат.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што раённыя арганізацыі Дрысеншчыны недаацэньваюць ролі спэцыялістаў ў сацбудаўніцтве.

Равец.

ПРАДУКЦЫЯ НЕ РЭАЛІЗУЕЦЦА

(Ліст з Віцебску)

На **Віцебскай** швейнай фабрыцы **«Прафінтэрн»** ляжыць мёртвым капіталам гатовая прадукцыя — **пальты школьнага асартымэнту на суму 200.000 руб.** Склад гатовых вырабаў перагружан, тое-ж на складах Саюзтрансу і на пакгаўзах. Яны таксама загружаны гатовай прадукцыяй — польтамі школьнага асартымэнту — вырабамі фабрыкі **«Прафінтэрн». Гэта выклікае фінансавыя затрудненьні фабрыкі і стварае перабоі ва ўсёй рабоце.**

Ня гледзячы на шматлікія паведамленьні і тэлеграмы **Беларускаму аддзяленьню Саюзшвэйзбыту** прыняць захады, да апошняга часу абсалютна няма ніякага адказу, ні парадаў для адправы.

Мы зьдзіўляемся, чаму зараз, у момант разгортваньня новага навучальнага году, аддзяленьне Саюзшвэйзбыту ня мае месца, куды збыць дзіцячыя польты. Зьдзіўляемся таксама, чаму яно не дасылае фабрыцы нарадаў.

Пракуратура рэспублікі павінна зараз-жа высьветліць гэтую справу і пакараць вінаватых.

М. Узьдзін, Брук.

Не выдаюць авансаў

Ня гледзячы на ясныя і сваячасовыя пастановы партыі і ўраду аб папярэднім авансаваньні калгасьнікаў на 10-15 проц. ад фактычна намалочанага збожжа, калгас **«Чырвоная Арэса», Глускага раёну,** злачынна ігнаруе гэтыя пастановы. Авансаваньне да гэтага часу не праведзена. Старшыня калгасу заяўляе:

— **Пасьпеем яшчэ зрабіць выдачу авансаў.**

У рэзультаце адсутнасьці матэр'яльнай заахвочанасьці калгасьнікаў да працы, калгас мае рад прарываў. Яшчэ ня ўбрана 250 га сенажацяй, плян пасеву азімых выканан на 30 проц. Вось чаго каштуе калгасу несваячасовая выдача авансаў. Рабочая сіла ў калгасе ёсьць, але на работу ня выходзяць.

Усе гэтыя злачынныя скажэньні пастаноў партыі праходзяць на вачох парт'ячэйкі і сельсавету. **Глуская райКК-РСІ** павінна зьвярнуць увагу на калгас **«Чырвоная Арэса»** з мэтай аздараўленьня яго работы.

Адзінец.

ДЫРЭКТЫВА, ПЕРАТВОРАНАЯ У ЦЭНТНЭРЫ

„Жартайка“

Выпаўшы з вярхоўяў, мінуючы Бярэзінскі канал, Бярэзіна ўпадае ў возера **Пялік**, разьліваючыся шырокай воднай роўняй. На левым беразе возера, сярод бясконцых балот і лясоў знаходзіцца самы воддальны сельсавет Барысаўшчыны — Жартайскі, або, як яго тут называюць, «Жартайка».

Аб сваім мінулым жартайцы ўспамінаюць з неахвотай, часта з жудасьцю. Пасьля таго, як адшумела навальніца грамадзянскай вайны, тут на працягу году год наводзілі страх на мясцовае насельніцтва банды Семянюка, Моніча і Рабцэвіча. Ва ўсіх яшчэ ў памяці крывавыя справы гэтых зьвераў — наймітаў генэральных штабаў міжнароднага імпэрыялізму. Не забыт бандыцкі налёт Моніча і яго спадручных па хуткі цягнік пад станцыяй Крупкі ў 1924 годзе. У жартайскіх лясох дагэтуль захаваліся нэры гэтага зьвер'я.

Толькі пасьля таго, як усе бандыты былі вылаўлены, а іх прыяцелі кулакі высланы, жартайцы зажылі новым жыцьцём. Сельсавет уключыўся ў агульны бурны паток сацыялістычнай будоўлі.

62,7 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак сельсавету аб'яднана ў калгасы. Першым у раёне сельсавет выканаў гадавы плян збожжазагатовак, унёс 74,2 проц. сельгаспадатку і 65 проц. страхоўкі. Засеяна 95 проц. азімага кліну. Цяпер жартайцы сьпяшаюцца ўбраць бульбу, каб хутчэй разьлічыцца з дзяржавай, засыпаць капцы і разьмеркаваць паміж калгаснікамі па працадніёх.

Працадзень — рухавая сіла

Цішыню калгаснай хаты парушае цоканьне костачак. Малады рахункавод **Міхась Чычын** правярае цэпнасьць працадня ў калгасе **«Х-ты зьезд саветаў»**. Сакратар сельсавецкай парт'ячэйкі **Рыгор Лукашэвіч** уважліва сочыць за кожным яго рухам.

— 1,5 кгр. жыта, ¾ кгр. ячменю і гароху, 15,5 кгр. бульбы, — бойка выстукае на шчотах Міхась. Гэта цэнасьць працадня калгасу. Тут кожны калгаснік, які працуе ў полі ці на гумне, добра ведае, колькі ён штодзенна зарабляе.

Малады рахункавод, які аўладаў тэхнікай калгаснай бухгальтэрыі, рэгулярна вядзе рахунак працадзён. Раз у пяцідзеўку ён заносіць працадні ў працоўныя кніжкі калгаснікаў, а потым у асабісты рахунак кожнага.

Добра наладжаны ўлік у вялізарнай ступені ўплывае на ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны і павышэньне якасьці працы.

— У калгасе 60 працаздольных — расказвае Чычын, — 12 чалавек калгас вылучыў на адыходныя работы. Рэшта штодзенна выходзіць на калгасныя палі. Жыта ўбралі яшчэ 31 ліпеня. За 10 дзён — 32 га. 40 га яравых закончылі ўбіраць 20 жніўня, а 9 верасьня калгас ужо засеяў азімы клін. Зараз калгасныя коні ўзьнімаюць зяб.

— Калгас поўнасьцю выканаў гадавы плян збожжазагатовак, здаў дзяржаве 10 цэнтн. збожжа і 37,5 цэнтн. бульбы (заданьне 40 цэнтн.). Калгаснікам раздалі авансы па працадніёх.

Скрып дзьвярэй перарваў расказ Чычына аб калгасных буднях. У хату ўвайшоў высокі, [illegible] калгаснік. Гэта старшыня калгасу — Кудравец Мікіта, кандыдат партыі і член сельсавету Мікіта ўвесь час цягне на буксіры сваіх аднасяльчан-адпаасобнікаў. Вось зараз ён скончыў абход адпаасобных гаспадарак, якія сёньня вяжуць на ссыпны пункт астачу збожжа, што з іх прылічваецца.

Мікіта, як член сельсавету, уважліва сочыць за выкананьнем адпаасобнікамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

— Камісію садзейнасьці самі абіралі, плян прымалі на сходзе... Польга далей адцягваць, бо вешці-ж трэба 45 кілёмэтраў, а невядома колькі цёплых сонечных дзён яшчэ дасьць нам восень. Нечакана можа падкрасьціся непагадзь, — сказаў ён, рашуча размахваючы доўгімі рукамі.

Цэнасьць працадня правяраецца зараз ва ўсіх калгасах «Жартайкі». У мінулым — вёска **Хонава** складалася з 10 гаспадарак з вузкімі палоскамі, на якіх кожны капаўся ад цямна да цямна. Зараз калгас **«3-ці зьезд саветаў»** — друкная арцель якая зруйнавала дзедаўскія межы і ператварыла вузкія палоскі ў шырокае калгаснае поле.

Старшыня Жартайскага сельсавету Паўлавец Сьцепан

Старшыня калгасу **Апэт Якуб**, беспартыйны серадняк, які ўвесь свой накоплены гадамі гаспадарчы вопыт аддаў арцелі, падводзіць вынікі напорыстай работы калектыву. На працадзень, па скромных папярэдніх падліках Апэта, прыпадае 1,5 кгр. жыта, 3 кгр. ярыны, 5 кгр. бульбы.

Сям'я Апэта Філімона найбольш працаздольная ў калгасе. Яна выпрацавала 440 працадзён і атрымае 6,5 цэнтн. жыта, 13,2 цэнтн. ячменю і гароху і 22 цэнтн. бульбы.

Працадзень у Жартайскім сельсавеце перастаў быць адцягненай велічынёй, стаў рухавай сілай калгаснае працы. «Палачкі» 1930 году і ўраўнілаўку 1931 году замянілі кілёграмы жыта, бульбы і ячменю.

Плян даведзен да мас

Жывая штодзенная сувязь з калгасамі і вёскамі, апэрацыйнасьць — у аснове работы сельскага кіраўніцтва. За апошнія паўтара месяца прэзыдыум сельсавету тры разы зьбіраўся непасрэдна ў масах — у калгасах і вёсках. На парадку дня баявыя пытаньні ўборкі ўраджаю і загатовак.

Дырэктыву райкому аб здачы збожжа, атрыманую 14 жніўня, «Жартайка» сустрэла арганізацыйнай масавага чырвонага абозу. Раніцой доўгай істужкай пацягнуліся да раённага цэнтру сотні калгасных і адпаасобных фурманак, гружаных збожжам. Ініцыятарамі абозу былі перадавыя калгасы «Расьсьвет» і «Х зьезд». Калгасы і адпаасобнікі здалі 6.800 кгр. збожжа новага ўраджаю.

Праз два дні сакратар партыйнай ячэйкі Рыгор **Лукашэвіч** склікаў усіх камуністаў для абмеркаваньня дырэктывы райкому. Загадзя расставілі сілы, вызначылі, хто за што адказвае. Кожны партыец быў прымацаваным да пэўнага калгасу ці вёскі. Увесь актыў сельсавету ўзьнялі на ногі. Перш за ўсё плян здачы збожжа быў абмяркован на сельсавецкім зьлёце груп беднаты. Плян дэтальна прапрацавалі ў разрэзе кожнага калгасу, кожнай вёскі. Падлічвалі абмалот, засеянную плошчу, пагалоўе фэрм. Пасьля зацьвярджэньня пляну збожжазагатовак прэзыдыумам сельсавету, яго перадалі на абмеркаваньне пашыранага пленуму сельсавету з удзелам старшынь калгасаў і ўсяго сельскага актыву. Так яго давялі да кожнага калгасу і населішча, а потым перанесьлі ў сельскія групы беднаты, камісіі садзейнасьці і адтуль на сельскія сходы, дзе жартайскія камуністы адшуквалі новыя шляхі правільнага і моцнага ўплыву на адпаасобнікаў. Так дырэктыва, даведзеная да шырокіх мас, была ператворана ў цэнтнэры. **На 20 верасьня Жартаўскі сельсавет здаў 255 цэнтн. збожжа — 107,5 проц. заданьня.**

Людзі, якія вырашылі посьпех

Сакратар парт'ячэйкі Жартайскага сельсавету тав. Лукашэвіч

Рыгор Лукашэвіч — сакратар жартайскай парт'ячэйкі. За 36 год ён прайшоў суровую жыцьцёвую школу. Сын рабочага, Рыгор пачаў свой жыцьцёвы шлях на палівачным і лесапільным заводах.

Юнаком ён заражаецца духам пратэсту супроць эксплёатацыі гаспадароў і царскай апрычніны.

Імпэрыялістычная вайна закінула яго ў далёкія Карпаты, але вялікі Кастрычнік вырваў яго з пекла сусьветнай бойні і вярнуў на радзіму.

1919-1920 г. г. Рыгор у падполлі ў белапанскім тылу. Толькі шчасьлівы выпадак пазбавіў яго ад крывавай расправы белапалякаў.

Калі партыя паслала Лукашэвіча на работу ў вёску, ён ня мог адрозьніць пшаніцы ад ячменю. Для таго, каб лепш зашамятаць гэтыя культуры, ён загортваў іх у наперкі і надпісваў назвы. Зараз Рыгор ужо добра разумее сельскую гаспадарку. Рэдка калі ён пасьлядзіць дзень на месцы. Усю сваю работу Лукашэвіч перанёс у калгасы і вёскі, ён часта інструктуе старшынь калгасаў, членаў сельсаветаў, актывістаў. Ён рэгулярна правярае выкананьне кожнай дырэктывы парт'ячэйкі.

Сельсавецкая ячэйка расьце за лік калгаснага актыву. За кароткі час перавялі ў партыю 5 чалавек і прынялі 6 новых кандыдатаў.

Манулік Пётра, аднаасобнік вёскі Баравуха. З 1929 году ён ня раз пераабіраецца членам сельсавету. У в. Баравуха яшчэ няма калгасу. Манулік — заўтрашні калгаснік. Ён згуртаваў вакол сябе актыў з найбольш сьвядомых суседзяй. Дзякуючы рабоце гэтага актыву, Баравуха адна з першых выканала плян загатовак, здала дзяржаве 3 тоны збожжа. Баравуха датэрмінова выплаціла 1.550 руб. с.-г. падатку і страхоўкі і прыняла самаабкладаньне на 150 проц. Такіх вынікаў удалося дабіцца штодзённым растлумачэньнем сялянам апошніх пастаноў партыі аб калгасным гандлі, збожжа- і мясазагатоўках. Актыўнымі дапаможнікамі Мануліка зьяўляюцца члены камісіі садзейнасьці — сераднякі **Максімовіч, Мацяйкевіч і Кірпілеўскі.** Яны прымалі самы актыўны ўдзел у арганізацыі здачы збожжа. Да кожнага двара быў дыфэрэнцыяваны падыход — у залежнасьці ад моцнасьці гаспадаркі. Манулік падбірае ўжо ініцыятыўную групу для арганізацыі калгасу.

Ганна Шабура, жонка старшыні калгасу «Расьсьвет». Ганна радавая калгасніца. Ня гледзячы на вялікую сям'ю, яна прымае актыўны ўдзел у рабоце калгасу і хвалюецца за кожную дробязь, за найменшы непаладак. У «Расьсьвеце» недахват мужчынскай работай сілы. З 74 працаздольных — мужчын — 22, рэшта жанчыны. На ворыве не хапала людзей. Ганна першая заграпанавала арганізаваць жаночую брыгаду па ворыву, першая ўступіла ў брыгаду і пайшла па хатах вербаваць іншых. За ёй пайшло яшчэ 5 калгасьніц. Брыгада ўзарала 23 га і ўвесь час выконвала і перавыконвала норму.

Посьпех Жартайкі вырашылі вось гэтыя людзі, актыўныя будаўнікі новай сацыялістычнай вёскі.

Я. ЗОРЫН.

Верасень—Жартайскі с.-с.

На сходзе навуковых працаўнікоў г. Менску

УКЛЮЧАЕМСЯ ВА ЎСЕСАЮЗНАЕ СПАБОРНІЦТВА

па выкананьні пастановы ЦВК СССР аб вышэйшай і сярэдняй школе

Пастанова ЦВК СССР «аб вучэбных праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумах» выклікала новую хвалю актыўнасьці сярод навуковых працаўнікоў і студэнцтва пралетарскай сталіцы БССР—Менску. У гэтым можна было пераканацца на агульна-гарадзкім сходзе навуковых працаўнікоў, які адбыўся 28 верасьня ў вялікай залі камвузу.

З вялікім паўтарагадзінным дакладам аб задачах навуковых працаўнікоў у сувязі з пастановай ЦВК СССР выступіў старшыня ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў Беларусі **тав. Рыўлін.**

Адзначаючы бясспрэчныя дасягненьні савецкай вышэйшай школы за апошнія гады, дакладчык асабліва многа спыняўся на недахопах і скажэньнях у рабоце беларускіх ВНУ і ВТНУ.

— Партыя і ўрад у сваіх пастановах аб савецкай школе асабліва ўпор робяць на **якасьць**, якая зьяўляецца **рашаючым зьвяном** у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў савецкіх спэцыялістаў. У рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі ўказана, што: «Колькасны рост тэхнічных кадраў у Савецкім саюзе ні ў якім выпадку не павінен паменшыць значэньня пытаньня аб іх навуковай кваліфікацыі...».

Адсутнасьць цьвёрдых вучэбных плянаў, папаваньне так званых «пераходных» плянаў прыводзілі ў выніку да таго, што ў шмат якіх ВНУ мы ня мелі стабільнасьці вучэбнага працэсу. Значная неадпаведнасьць праграм па асноўных спэцыяльнасьцях і яшчэ большая—паміж аб'ёмам праграм і тэй колькасьцю гадзін, што адпускалася на вывучэньне дысцыплін; адсутнасьць ахопу ўсяго вучэбнага працэсу ў радзе праграм ВНУ; «заціраньне» агульна-тэарытычных і спэцыяльных дысцыплін; шматпрадметнасьць ды інш., — вось асноўныя бялячкі і недахопы ў рабоце нашых ВНУ. Аб усім гэтым надзвычай пераканаўча гаворыць пастанова ЦВК. А таму выпрацоўка цьвёрдых пастаянных праграм і вучэбных плянаў, аддаваньне максымуму ўвагі агульна-тэарытычным прадметам і спэцыяльным дысцыплінам, разгрузка праграм ад шматпрадметнасьці, увядзеньне факультацыйных прадметаў — вось галоўныя задачы ўсіх арганізацый ВНУ на сёньняшні дзень.

Дакладчык падрабязна спыніўся на пытаньні аб мэтадах выкладаньня.

— Мы павінны ўсімі мерамі і сродкамі змагацца са спробамі права-апартуністычных элемэнтаў, якія цягнуць да старой схалястычнай школы, са спробамі «левакоў», прапагандуючых адзіны універсальны мэтад, так званы «брыгадна-лябараторны мэтад». Мы павінны змагацца за роэнастайнасьць мэтадаў і форм вучэбнага працэсу, выходзячы з канкрэтных умоў данай ВНУ.

Пасьля дакладу тав. Рыўліна выступілі ў спрэчках высокакваліфікаваная прафэсура гор. Менску, выкладчыкі і асьпіранты.

— Пастанова ЦВК, — пачаў сваю прамову акадэмік **Леніч** — адкрывае новую эру ў будаўніцтве савецкай вышэйшай школы і дае ўсе магчымасьці прафэсуры і ўсяму навуковаму фронту працаваць больш энэргічна ў галіне падрыхтоўкі патрэбных краіне высокакваліфікаваных кадраў. І таму навуковыя працаўнікі павінны аддаць усе свае сілы і здольнасьці справе інтарэсаў пралетарскай дзяржавы.

Актывізацыя ўсяго вучэбнага працэсу і асабліва лекцыйнага мэтаду патрабуе ў першую чаргу праяўленьня вялікай актыўнасьці і зацікаўленасьці з боку прафэсарска-выкладчыцкага пэрсаналу.

Патрабаваньне ўраду аб наданьні новых спэцыялістам вучоных ступеняй, пры ўмове прадстаўленьня дыплёмаў і дысэртацый, дае штурмок самаўдасканаленьню сваёй прафэсіі і набыцьцю максымуму ведаў студэнцтвам і асьпірантурай.

Акадэмік **Лепц** прыводзіў факт, калі студэнтка апошняга курсу мэдінстытуту не магла перавесьці простых дробяй у дзесяцічныя. Калі было пастаўлена пытаньне аб немагчымасьці надаць ёй званьне доктара (бо яна ня эможа нават правільна напісаць рацэпт), дык студэнцкія арганізацыі прапанавалі... вылучыць яе на навуковую работу. Гэты факт яшчэ раз падкрэсьлівае, як на мясцох часам «разумеюць» барацьбу за якасьць навучаньня.

Праф. **Сарахцін** у сваім выступленьні прывёў канкрэтныя прыклады вылучэньня па навуковую работу менш здольных і падрыхтаваных студэнтаў.

Значную частку свайго выступленьня праф. Сарахцін прысьвяціў пытаньню правільнага ўліку нагрузак прафэсуры, дацэнтаў, асыстэнтаў у ВНУ, з тым, каб у іх заставаўся яшчэ час і для работы над сабой і для навуковай дзейнасьці.

Выступіўшы ў спрэчках тав. **Лойка** (інстытут эканомікі БАН) асабліва завастрыў увагу на неабходнасьць вывучэньня такой важнай дысцыпліны, як геаграфія, і на падрыхтоўку новых спэцыялістаў у гэтай галіне. У нас, у БССР. — гаворыць тав. **Лойка**, ні адзін інстытут ня рыхтуе спэцыялістаў па геаграфіі, нават у БАН няма ні аднаго асьпіранта, будучага спэцыяліста па геаграфіі.

Тав. Лойка прывёў некалькі прыкладаў, калі паступаючыя ў ВНУ не магли адказаць па такія пытаньні: дзе знаходзіцца Урала-Кузбас, Ангарбуд і інш. Нават элемэнтарных ведаў па геаграфіі ў многіх студэнтаў ВНУ няма таму, што вельмі часта ў вучэбных праграмах мала ўвагі аддавалася геаграфіі.

Праф. **Галанза** спыніўся на пытаньні барацьбы са шматпрадметнасьцю ў ВНУ. Да скарачэньня асобных прадметаў у вучэбных плянах і праграмах, — гаворыць тав. **Галанза**, — трэба падыйсьці надзвычай асьцярожна, з улікам спэцыфічнасьці кожнага ВНУ і запатрабаваньняў студэнцкіх мас. Далей ён прывёў факт, калі на факультэце савецкага будаўніцтва і права студэнт за тры гады вучобы павінен быў здаваць 48 прадметаў. А калі ўлічыць, што ў гэты час студэнты адлучаліся на практыку і інш. камісіі, дык у яго заставалася ня больш 1½—2 гады вучобы. Зусім зразумела, што ў такім разе студэнты не магли замацаваць у сябе тых ведаў, якія яны атрымлівалі ў ВНУ.

Праф. **Галанза** высунуў прапанову, каб студэнты, выяжджаючыя на вытворчую практыку, абавязкова рабілі справаздачу, ці нават здавалі асобныя калёквіумы па вытворчай практыцы.

Тав. **Юркевіч** (асьпірант БАН) спыніўся на пытаньні «абавязковага асартымэнту», калі ВНУ ня лічыліся з асабістымі нахіламі студэнта. Часта той ці іншы таварыш жадае спэцыялізавацца ў галіне мэдыцыны, а яго абавязкова прымушалі быць пэдагогам ці інжынэрам, і наадварот. Інакш яго лічылі дэзэртырам. Так, напрыклад, рабфак пры мэдінстытуце рыхтаваў студэнтаў для мэдінстытуту і не хацеў лічыцца з асабістымі жаданьнямі іх.

Тав. **Крывіцкі** высунуў прапанову, каб дыплёмныя работы студэнтамі і навуковыя дысэртацыі асьпірантамі пісаліся абавязкова па самых актуальных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва, выходзячы з сённяшніх задач нашай сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі і распрацоўкі праблем другой пяцігодкі.

Спыніўшыся на пытаньні распрацоўкі праграм і вучэбных заданьняў, тав. **Крывіцкі** падкрэсьлівае, што часта мы маем сьпіраньне граняй паміж асобнымі дысцыплінамі. Складальнікі праграм баяліся часта, каб чаго ня ўпусьціць, сказаць усё і аб усім. Гэты факт тав. Крывіцкі адзначае як самастрахоўку, як няўменьне скласьці выразную, марксыцка-вытрыманую праграму.

У прынятай рэзалюцыі агульны сход навуковых працаўнікоў гор. Менску пастанавіў распрацаваць пастанову ЦВК ва ўсіх ВНУ, ВТНУ і паасобных катэдрах, выходзячы з канкрэтных умоў данай ВНУ. Улічваючы вялізарнае значэньне, якое набывае зараз праца катэдры, сход прапанаваў гарбюро і мясцовым бюро сэкцый навуковых працаўнікоў прыняць актыўны ўдзел у рэарганізацыі працы катэдраў, дабіваючыся, каб па чале катэдраў былі пастаўлены высокакваліфікаваныя навуковыя працаўнікі, каб катэдры пад кіраўніцтвам дырэкцыі сталі сапраўды асноўным вагаром у палепшэньні якасьці работы ВНУ і ВТНУ.

Сход палічыў неабходным, каб ДВС пераглядзеў палажэньне аб катэдрах у адпаведнасьці з пастановай ЦВК.

Сход прапанаваў у месячны тэрмін правесьці нарады навуковых працаўнікоў па групах блізкіх дысцыплін (фізыка-матэматычнай, біялёгічнай, гістарычнай і г. д.) для абмену вопытам і вызначэньня мэтадаў занятак, найбольш адпавядаючых данym дысцыплінам.

Улічваючы неабходнасьць арганізацыі сыстэматычнага абмену вопытам работы па перабудове вышэйшай школы, сход палічыў неабходным выданьне Наркамасьветы разам з ЦК саюзу парасьветы і ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў друкаванага органу, прысьвечанага пытаньням перабудовы школы.

Агульны сход палучыўся да адозвы навуковых працаўнікоў і студэнцтва маскоўскага энэргетычнага інстытуту імя Молатава і машына-будаўнічага інстытуту імя Баўмана і заклікаў усіх навуковых працаўнікоў і студэнцтва г. Менску ўключыцца ў правядзеньне ўсесаюзнага сацыялабарніцтва ВНУ і ВТНУ па выкананьні пастановы ЦВК.

Нарэшце, сход абгаварыў пытаньне аб доме вучоных, які павінен пачаць свае працы ў першых лічбах пастрычніка.

Р. ЛЯПІЧ.



Гэнэратар № 5 Шцяроўскай электрастанцыі моцнасьцю ў 44 тыс. клят.

Ул. Северны

Сыгналіст грае “пападзі“...

Трубач дайграў «пад'ём». Апошні пераліў сыгналу патрыжаўся ў бурлівы паток абуджанага жыцьця чырвонасьпяжнага палка.

... 1 па сыгналу, з белых палатак, якія раскінуліся роўнымі радамі сярод кучаравых елак, з сурёзнымі ўдумлівымі тварамі, з моцнымі, нібы сталь, мускуламі з загарэлым, колерам бронзы, целам выходзілі людзі. Гэта людзі тыя, якія пядаўна зьмянілі зашмальцаваную рабочую блюзу на гімнасьцёрку з сінімі пятлічкамі, цяжкі молат, плуг з начышчаным да бляску зямлёй калгасных палёў лемяхом — на вінтоўку, кулямёт, калгаснага каняку на балвога, вернага таварыша кавалерыста — каня.

Гэта ўчарашныя ўдарнікі фабрык і заводаў, калгасных палёў, сёньняшнія энтузіясты, штурмуючыя вышыні баявой падрыхтоўкі.

Сёньня ў астраханцаў асабліва дзень.

Асабліва ён таму, што астраханцы, кінуўшыя першы выклік ўсёй акрузе — страляць па-варашылаўску меткі і хутка, — сваімі рэзультатамі ўпартай барацьбы за высокую агнявую падрыхтоўку павінны расьлісацца пад гэтым выклікам, даказаць усёй акрузе, што астраханцы аўладалі варашылаўскай меткасьцю.

Сёньня ў астраханцаў інспэктарская стральба.

Яшчэ ўчора роўным, заўсёды спакойным тонам, выразна, быццам адрубаючы кожнае слова, начальнік штабу аддаваў апошнія распараджэньне. Яшчэ раз асабіста праверыць гатоўнасьць стрэльбішча, арганізацыю сувязі, абсталяваньне агнявога рубяжу, дакладна выконвайце мой плян мішэннай абстаноўкі...

8 гадзін. Роўна, як па прачэрчанай вопытным чарцёжнікам лініі, зялёнай сьцяной, з малаццаватай выпраўкай з начышчанымі ботамі, пастроіліся эскадроны.

Трубы аркестру грымнулі марш... Бліснула на сонцы шчацінна штыхоў... Загрукацелі калёсы кулямётных тачанак... Полк стройнымі радамі рушыўся на стрэльбішча.

Дарога праходзіць зьвілістай істужкай праз сасновы лес. Да стрэльбішча адзін кілёмэтр. Але і тут не траціцца даромна час, разгорнута работа.

Байцы на-ходу заключаюць дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва, папамінаюць адзін аднаму аб выніку Акругі, правяраюць веданьне задач, належачых да стральбы.

Полк інспэктаваў камандзір корпусу **Цімашэнка** — герой грамадзянскай вайны, які мае тры ордэны Чырвонага сьцягу, з выгляду суровы... Суровы ён таму, што грамадзянская вайна ўштала ў яго кроў жалезную дысцыпліну, цьвёрдую волю, бясспрыкладную адвагу, высокую патрабаўнасьць да сябе і сваіх падначаленых. Суровы з выгляду, а па сутнасьці ленны таварыш, баец, — так гавораць аб ім байцы і камандзіры.

Стральба пачынаецца стральбой з нагану пачсаставам. Страляюць першую задачу.

У чаканьні сваёй чаргі байцы разьмясьціліся ля паходнага клюбу. На гэты раз асабліва ўдала клюб разгарнуў работу. Арганізавана кансультацыя па пытаньнях стралковай тэарэтычнай справы, па апошніх пастановах партыі і ўраду. Шырока разгорнута наглядная агітацыя, з удалым мастацкім афарміленьнем. Выпускаліся «Ільлічоўкі», «Кракадзілы» на стральбе.

А ў паасобных групах вяліся гутаркі пізавымі агітатарамі. Усе зьвяньні партыйна-масавай работы выразна выконвалі сваю задачу.

Дзяжурны па стрэльбішчу т. Парэцкі выразна адрапартаваў камандзіру корпусу — стрэльбішча да адкрыцьця агню гатова.

— Пачынайце таварыш **Голубеў**, — зварачаючыся да камандзіра палка, загадаў Цімашэнка.

Загадана пачынаць... Сьцяг узьняты. Два сыгналісты, што стаяць ля сьцягу, пратрубілі «пападзі... пападзі». Зьмены рыхтаваліся. Апошні раз агледзелі сваю зброю, правяралі падгонку рамня. Кожны баец быў заняты аднэй думкай — выканаць. Ня можа быць, каб падкачаў... Выканаю на «выдатна» У гэтым быў упэўнен кожны баец Астраханскага палка.

На стрэльбішчы, лявей галоўнага напрамку быў спэцыяльна абсталяван цір для стральбы з «Нагану».

Агнявая мяжа праходзіла па ўскрайку невялікага гаю. І вось на гэтай агнявой мяжы выстраілася зьмена начсаставу. Стройна стаяць камандзіры з узьнятымі ўверх рэвальвэрамі.

Гучна пасонца каманда кампалка — самастойна, агонь...

На агнявой мяжы абсалютная цішыня, нават вецер, быццам разумеючы адказнасьць інспэктарскіх стрэльб, сьціх.

Дулы рэвальвэраў накіраваліся ў сэрца мішэні — у дзесятку...

На флянгах і на сярэдзіне па адным суха пачуліся стрэлы.

Так пачалася інспэктарская стральба.

З вялікім напружаньнем чакалі рэзультатаў першай зьмены. Мінуты казаліся гадзінамі... Нарэшце, прагрымеў стрэл... Трубач дайтрываў «адбой». Сьцяг апушчан... Камкор ля мішэні. Страляючыя падлічваюць ачкі.

Усе як адзін дакладваюць «Выканаў на «выдатна», выканаў «добра» — выдатна...

Першая зьмена задачу выканала на «выдатна».

Так праходзілі зьмена за зьменай і таксама дакладвалі «выдатна, добра». Стральба ішла строга па пляну. Добра распрацаваны, добра прадуманы плян забясьпечвае посьпех. Недарма нач. штабу гаворыць — «Ад плянаў залежыць многае». А ў пляне значыцца 12—30 стральба з вінтовак. Страляе 2-ю задачу зводны эскадрон.

На камандным пункце камандзір корпусу, кампалка, дзяжурны па стрэльбішчу і два сыгналісты...

Як і раней трубачы прызыўна трубяць «Пападзі... пападзі...»

Зьмена на агнявой мяжы, але... нікога ня відаць — байцы дасканала замаскаваліся.

Уся ўвага прыкутных была прыкавана да першай зьмены. Страляюць другую задачу, а другая задача ёсьць краяўгольны камень стралковага майстэрства. Аўладаць другой задачай — аўладаць усім курсам стрэльб.

Прагрымелі першыя стрэлы. Глуха адказала роха. Рэзка, разрываючы паветра, кулі палі песьню сьмерці.

Першая зьмена — першыя рэзультаты. Байцы ў паўголаса перагаварваліся паміж сабой. Яны гаварылі аб стральбе, аб тым, як рыхтаваліся да інспэктарскіх стрэльбаў, хто колькі выбіваў ачкоў, у каго як б'е вінтоўка, якая пасажана мушка і г. д.

А старэйшыя байцы расказвалі маладым, як яны ў мінулым заваёўвалі пераходны сьцяг ангельскай кампартыі.

— Вось, хлопцы, калі сёньня прамажам — адбяруць ад нас сьцяг ангельскай кампартыі, — пэўнена прагаварыў чырвонаармеец Клімаў.

— Не прароч там, прарок... Паглядзім, як стрэльнем. Вунь нашы камандзіры з рэвольвэру — «добра», а з вінтовак — «выдатна», а хто нас вучыць? — Яны. Значыцца мы ня маем права горш іх страляць і ня стрэльнем горш, — верна хлопцы?

— Не, ужо сьцяг не аддамо, сьцяг у надзейных руках, — загаварылі байцы.

Нечакана для байцоў хрыплым басам загаварыў рупар.

— Стой, хлопцы, рэзультаты першай зьмены. Усе затрымалі дыханьне, здавалася, што чырвонаармейцы гатовы пэглынаць кожнае слова.

— Алё... алё... Слухай рэзультаты першай зьмены. Страляла 10 чалавек з іх 7 выканалі на «выдатна» і зьвышвыдатна, 3 на «добра». І далей рупар заклікаў: — «астраханцы, тэмпаў не здамо, выклік апраўдаем, інспэктарскую стральбу здамо на «выдатна». З вялікім напружаньнем выслухвалі байцы паведамленьне.

Зноў сыгнал. Зноў сухі трэск стрэлаў, зноў кулі рыкашэтам са злобай узрывалі пясок і ўляталі далёка ў балота. Зноў рэзультаты — «выдатна».

А там у калцы дня загаварылі кулямёты, спачатку лёгкія, потым станкавыя. Дасканала падрыхтаваныя кулямёты, быццам захлыналіся, выстукваючы таксама «выдатна». Глухім рохам адгуквалася балота.

Ля кулямёту чырвонаармеец **Дзевяткін** калгаснік-камсамолец, балы, жыцьцярадасны, вочы яго накіраваны па цэль... Стаіць — но варухнецца, мускулы напружаны... Ён увесь захоплен імкненьнем выканаць на «выдатна». Рэзка пачулася каманда. «На перабягаючай групе, шэсьць, цэлік 0—аўтаматычна заражай».

Падобны да дзікага зьвера, ірвануўся Дзевяткін да кулямёта... Сэкунды — кулямёт заражан, яшчэ сэкунды — устаноўлен прыцэл і цэлік. Не прайшло і дзевяці сэкунд кулямёт навядзен у цэль, яшчэ сэкунда кулямёт нервова задрыгаў, затарахцеў. Густы сноп куль правільна расьсейваўся па цэлі. Рэзультат — «звышвыдатна».

Так, замест 45 сэкунд, Дзевяткін за дзевяць сэкунд выканаў задачу на «звышвыдатна». Дзевяткіных у палку нямала.

Так у напружанай барацьбе, захопленыя энтузіязмам, цьвёрда і ўпэўнена астраханцы ішлі да стралковых перамог. Агульная ацэнка па полк — «выдатна».

Астраханцы з гонарам апраўдалі свой выклік.

Сонца сваім ніжнім абрэзам датыкалася зямлі. Дзень канчаўся. Сухі трэск апошніх стрэлаў павіс над балотам. Аркестр прагрымеў марш...

«По долинам, по загорьям
Шла дивизия вперед,
Чтобы с бою взять примор'е,
Белой армии оплот...

Песьні стройных калён астраханцаў, якія зьвартаюцца ў полк, даносіліся далёкім глухім рохам да стрэльбішча.

Полк у сваіх стралковых посьпехах шмат чым абавязан кіраўніку т. **Голубеву**. Гэта чалавек з выключнай энэргіяй, волай, настойлівасьцю, ініцыятывай. Яго воля, упартасьць, энэргія, асабістая дысцыплінаванасьць каваліся ў дружным калектыве Пуцілаўскага заводу, на франтох грамадзянскай вайны.

Тав. Голубеў ня церпіць габінэтнага кіраўніцтва, ён заўсёды на стрэльбішчы, на запятках. Тут жа паказвае памылкі і дапамагае ўнікнуць апошніх. Ён узорна кіруе партыйнай арганізацыяй. Умела сталучае стральную работу з палітычнай і вырашае гэтыя дзве задачы як адну — так, як указаў тав. **Гамарнік.**

Стралковыя перамогам яшчэ былі папярэднікамі ўзорна пастаўленае палітычнае выхаваньне байцоў, фізычная культура. На гэтых дысцыплінах полк таксама, як і па стральбе, займае вядучае месца ў дывізіі.

Працоўныя Савецкай Беларусі ганяраюць Астраханскім палком. Яны ведаюць, што на мяжы, якая аддзяляе краіну Саветаў ад капіталістычных краін, стаіць **БЕРНЫ** вартавы.

НЕЙРАТ ПАКІДАЕ ЖЭНЭВУ

Водгукі германскай прэсы

БЭРЛІН, 29. Закранаючы ад'езд германскага міністра замежных спраў Нэйрата з Жэнэвы, «Фосішэ цэйтунг» падкрэсьлівае, што Нэйрат пакідае Жэнэву, ня гледзячы на паведамленьне Эрыё аб выступленьні яго ў Жэнэве. Паводле думкі «Фосішэ цэйтунг», Нэйрат сваім ад'ездам хоча дэманстрацыйна падкрэсьліць бясплённасьць усіх спроб пасярэдніцтваць паміж Германіяй і Францыяй. «Ад'езд Нэйрата з Жэнэвы, — піша «Фосішэ цэйтунг», — такім чынам зьяўляецца дэманстрацыяй, якая сьведчыць аб сур'ёзнасьці становішча».

Французская прэса пагражае абсьледваньнем германскіх узбраеньняў

ПАРЫЖ, 29. Гаворачы аб адмаўленьні Германіі прымаць удзел у работах канфэрэнцыі па «раззбраеньні» **«Франс мілітэр»** піша: «Германія жадае ўнікнуць пастаноўкі пытаньня на канфэрэнцыі па раззбраеньні, напярэдадні абсьледваньня яе ўзбраеньняў на аснове 213 арт. вэрсальскага дагавору. У партфэлі Эрыё ёсьць дасье (папка) з дакумэнтамі аб незаконных узбраеньнях Германіі. Гэта дасье было падрыхтавана яшчэ Тард'е. Да гэтага часу яно ня было агалошана таму, што Францыя шанавала некаторыя нэйтральныя дзяржавы, якія ўспамінаюцца ў дакумантах, як Галяндыю, якая пастаўляе Германіі цяжкую артылерыю, Швэцыю, што будуе для яе баявыя самалёты і г. д. Цяпер, аднак, Францыі ўдалося вызваліцца ад празьмернай «щепетильности» і Эрыё гатоў у выпадку патрэбы скарыстаць гэтае досьё».

Падрабязнасьці роспуску германскага рэйхстагу

БЭРЛІН, 27. Засядала камісія рэйхстагу аб ахове праваў народнага прадстаўніцтва. Камісія разглядала пытаньне **аб законнасьці роспуску рэйхстагу. У якасьці сьведак** зьявіліся **рэйхсканцлер Папэн, міністар унутраных спраў Гайль і статс-сакратар Планк.**

Перад пачаткам паказаньняў камуніст **Торглер** унёс прапанову — карыстаючыся прысутнасьцю членаў ураду, прапанаваць ураду скасаваць надзвычайныя дэкрэты. Гэта прапанова была адхілена ўсімі галасамі за выключэньнем камуністаў.

У паказаньнях Папэн падкрэсьліваў, што пытаньне аб роспуску рэйхстагу ня было прадвырашана, што за два дні да роспуску рэйхстагу ён умовіўся з старшынёй рэйхстагу Герынгам, што яму, Папэну, бязумоўна, будзе забясьпечана магчымасьць агаласіць урадавую дэклярацыю. Папэн указаў таксама, што Герынгу было дана зразумець, што «ўрад цьвёрда парашыў распусьціць рэйхстаг у выпадку прыняцьця пастановы аб скасаваньні надзвычайных дэкрэтаў або вотуму недавер'я». На пытаньне, калі быў надпісан дэкрэт аб роспуску рэйхстагу, Папэн адмовіўся адказаць. Астатнія члены ўраду пацьвердзілі паказаньні Папэна.

Старшыня фракцыі германскіх нацыяналістаў Обэрфорэн заявіў, што задачай яго партыі было дабіцца роспуску рэйхстагу.

Камуністычная частка камісіі выказалася супроць раздуваньня фармальнага боку справы і прапанавала прызнаць законную сілу за ўхваленымі рэйхстагам пастановамі аб скасаваньні надзвычайных дэкрэтаў і вотуму недавер'я ўраду Папэна. Камуністы прапанавалі таксама камісіі прыняць пастанову, каб рэйхспрэзыдэнт Гіндэнбург неадкладна скасаваў надзвычайныя дэкрэты ад 4 верасьня, усе распараджэньні, выданыя на аснове гэтага дэкрэту.

Гэта прапанова камісіяй была адхілена, партыя цэнтру ўстрымалася, заявіўшы, што камісія ня мае права прымаць пастановы з патрабаваньнем скасаваньня надзвычайных дэкрэтаў. Камісія прыняла прапанову камуністычнай часткі аб тым, каб урад прадстаў перад камісіяй і адказаў за свае дзеяньні.

Наступнае пасяджэньне камісіі адкладзена на неакрэсьлены час.

ЧАЦЬВЕРТАЕ ПАРАЖЭНЬНЕ НАНКІНУ

Урачыста абвешчаны Чан Кай-шы чацьверты паход супроць савецкіх раёнаў, мяркуючы па ўсім, ператвараецца ў чацьвертае паражэньне Нанкіну. Урадавы гамінданаўскі друк разгласіў па ўсім сьвеце посьпехі нанкінскіх войск, нібыта разграміўшых Чырвоную армію пад Чжанчжоу і на поўнач ад Ухану. Усьлед за тым, пасьля некалькіх пераможных паведамленьняў, наступіла перадышка, і сумным папераджальным сыгналам зьявілася распараджэньне штабу Чан Кай-шы, якое забараняе друкаваць якія-б там ні было паведамленьні аб ходзе апэрацый супроць чырвоных войск. Раз нельга друкаваць, значыць весткі з фронту ідуць невясёлыя...

— Вораг высьлізгвае, — піша шанхайскі карэспандэнт «Н'ю-Ёрк Таймс» і далей малюе яркую карціну чацьвертага паходу паводле самых апошніх даных да паловы верасьня.

«Першая Чырвоная армія, — піша карэспандэнт, — да гэтага часу трымае ў сваіх руках вялізарную тэрыторыю, якая ўключае ў сабе паўднёва-ўсходнюю частку правінцыі Цзянсі, заходнюю частку правінцыі Фуцзян і невялікую частку поўначы Гуандуньскай правінцыі.

Другая армія знаходзіцца ў двух асобных раёнах Хубэю. Адзін з іх займае тэрыторыю паміж гарадамі Ханькоу і Шашы, другі — паміж гарадамі Шашы і Ічанам.

Чацьвертая армія трымае ў сваіх руках заходнюю частку правінцыі Аньхуэй, частку паўднёва-ўсходняга кута правінцыі Хэнань і значную частку правінцыі Хубэй на ўсход ад Ухану.

Восьмая армія кантралюе тэрыторыю на ўсход ад чыгункі Ханькоу-Чанша і працягвае налёты на гэтай лініі ў раёне паміж Ханькоу і Ічжоу.

Паведамленьні другіх армій ня больш пацешныя для Нанкіну. Замежны друк у дадатак да гэтага паведамляе, што ў руках чырвоных знаходзіцца тэрыторыя, якая знаходзіцца паміж буйнейшымі цэнтрамі Ганьчжоу (Цзянсі), і Чанша (Хунань). Апрача таго, паводле слоў «Н'ю-Ёрк Таймс», ёсьць яшчэ два «камуністычныя астраўкі», адзін з якіх разьмешчан на поўдзень ад Аньціну (галоўны горад правінцыі Аньхуэй) і другі — на ўсход ад возера Поянь (на поўначы Цзянсі).

Бясспрэчна, што амэрыканскі карэспандэнт зусім ня схільны перабольшваць перамогі Чырвонай арміі, і калі ён усё-ж вымушан паведамляць гэтыя факты, то, відавочна, толькі таму, што яны самі прымушаюць аб сабе гаварыць. Якія-ж вывады назіральнага амэрыканца?

— З наступленьнем восені, — піша ён, — становіцца ўсё больш відавочным, што чацьверты паход нанкінскага ўраду супроць чырвоных скончыцца, як і папярэднія паходы, не ў карысьць Нанкіну. Урадавыя войскі, пачынаючы з чэрвеня, толькі два разы здолелі аказаць супраціўленьне чырвоным часьцям, папярэдзіўшы наступленьне на Нанкін і адцясьніўшы чырвоных ад Ханькоу. Апрача гэтага, урадавыя войскі ня мелі ні аднэй больш ці менш значнай перамогі.

Сакрэт посьпехаў Чырвонай арміі зразумелы нават для гэтага імпэрыялістычнага агента. Спыняючыся на становішчы чырвоных войск і адзначаючы стратэгічныя перавагі чырвоных перад урадавымі войскамі, карэспандэнт заяўляе, што «сялянскае і гарадзкое насельніцтва значна больш задаволена тым ладам, які ўстаноўлен на савецкай тэрыторыі Кітаю», чым рэжымам у раёнах, што знаходзяцца пад кантролем нанкінскага ўраду.

— Ня гледзячы на тое, — сумна падкрэсьлівае агент Уолл-Стрыта, — што ўрадавым войскам удалося затрымаць прасоўваньне чырвоных часьцей уніз па рацэ Янцзы да мора, урад лічыць усё-ж неабходным трымаць вялікую колькасьць войск у цэнтральных правінцыях для таго, каб аказаць процідзеяньне далейшаму пашырэньню савецкіх тэрыторый. Салдаты ўрадавых войск, месяцамі не атрымліваючы пэнсіі, лёгка пераходзяць на бок чырвоных разам з вінтоўкамі і амуніцыяй. Гэтаму спрыяе палітычная няўстойлівасьць ураду і спрэчкі паміж мілітарысцкімі клікамі.

Гэта пішуць людзі, якія дапамагаюць Чан Кай-шы. Трэба думаць, што сапраўднае становішча рэчаў нават перавышае тое, што адважыўся даверыць сваім чытачом «Н'ю-Ёрк Таймс».

ТЫРАЖ 3-й УСЕСАЮЗНАЙ ЛЁТАРЭІ АЎТАДОРУ

29-30 верасьня ў Менску адбыўся тыраж 3-й усесаюзнай лётарэі Аўтадору. У тыражы разыграна 1.668 выйгрышаў на суму 62.500 руб. Асноўныя выйгрышы—5 аўтамабіляй («Форд»), або трактараў па выбару выйграўшага, коштам у 2.500 р. кожная —прыпалі на наступныя сэрыі і №№ білетаў 19-га разраду: сэрыя 3.206, білет 34; сэрыя 4.359, білет 23; сэрыя 4.238, білет 46; сэрыя 0.392, білет 27; сэрыя 4.059, білет 34 і сем матацыклетаў або трактарных снопавязалак, коштам у 1.000 руб. кожная, выйгралі: сэрыя 1.995, білет 53; сэрыя 4.273, білет 45; сэрыя 0.025, білет 60; сэрыя 2.621, білет 47; сэрыя 3.108, білет 45; сэрыя 2.124, білет 83; сэрыя 3.178, білет 94.

Тыраж праходзіў пры вялікай зацікаўленасьці рабочых, калгасьнікаў і чырвонаармейцаў. Цэнтральны Прэзыдыум Аўтадору СССР у часе тыражу ўручыў сьцяг Аўтадору БССР за добрую работу па зборы сродкаў на матарызацыю і мэханізацыю Чырвонай арміі і пагранчасьцей.

На жэнэўскай „гаварыльні"

Новыя праекты „раззбраеньня"

ЖЭНЭВА, 28. Прыехаўшы ўчора ўвечары Эрыё меў паўгадзіннае спатканьне з Саймонам, які ўчора-ж выехаў у Лёндан для ўдзелу ў пасяджэньні габінэту і вернецца ў Жэнэву не раней канца тыдня. У часе гэтай гутаркі Саймон інфармаваў Эрыё аб зьмесьце сваёй гутаркі з фон-Нэйратам.

У Жэнэве цыркулююць розныя чуткі аб плянах «раззбраеньня», у арганізацыі бясьпечнасьці, якія выпрацоўваюцца рознымі членамі Лігі нацый, у прыватнасьці, скандынаўскімі краінамі. Называюць праект пакту бясьпечнасьці, які прыпісваецца прадстаўніку Грэцыі **Політысу і Бэнэшу.**

Паводле другіх чутак, прадстаўнік Даніі **Мунк** сумесна з радам іншых малых дзяржаў выпрацоўвае праект, у якім **імкнецца прыстасаваць плян Гувэра да цяперашняга становішча, у прыватнасьці, да франка-германскіх супярэчнасьцяй.** Мунк прадугледжвае ў сваім праекце інтэрнацыяналізацыю грамадзянскай авіяцыі, забарону бамбардыровачнай авіяцыі і ўзмацненьне арбітражу. Таксама зноў гавораць аб пляне бэльгійца **Буркена,** які высоўваўся яшчэ ў пэрыяд Лёзанны. Апрача таго, складаецца яшчэ шмат розных плянаў і праектаў, якія маюць адну і тую-ж мэту: зноў завесьці спыненую з-за германскага выступленьня машыну канфэрэнцыі па раззбраеньні.

Гэндэрсон у канцы ўчарайшага пасяджэньня бюро канфэрэнцыі заявіў, што ён спадзяецца ў бліжэйшы час мець яшчэ адно спатканьне з фон-Нэйратам. У германскіх колах указваюць, што візыт фон-Нэйрата Гэндэрсону быў простым актам ветлівасьці і ніякага значэньня перагаворы з Гэндэрсонам мець ня могуць.

Сусьветная эканамічная канфэрэнцыя ў Жэнэве

ЖЭНЭВА, 28. Рада Лігі нацый занялася абгаварэньнем пытаньня аб «удзеле прэсы ў арганізацыі міру». Рада пастанавіла перадаць пленуму Лігі рэзалюцыі капэнгагенскай канфэрэнцыі журналістаў і думкі асацыяцыі журналістаў, якія паступілі ў адказ на анкету Лігі.

Рада Лігі абгаварыла далей пытаньне аб скліканьні камісіі экспэртаў для падрыхтоўкі сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі. **Рада пастанавіла склікаць гэту камісію ў Жэнэве** і перадаць сакратарыяту Лігі вызначэньне функцый сакратарыяту камісіі. Мяркуюць, што гэта камісія зьбярэцца 13 кастрычніка.

Белагвардзейскія бандыты ячшэ будуць патрэбны сваім гаспадаром

БЭРЛІН. Згодна паведамленьня праскіх газэт, белагвардзейцу **Валевіку,** прыгаворанаму два гады таму назад да пакараньня сьмерцю за забойства сям'і праскага юбэліра і некалькіх паліцэйскіх, гэтымі днямі прэзыдэнтам Масарыкам сьмяротная кара заменена пажыцьцёвым зьняволеньнем.

У рэзультаце сьледства выявілася, што **Валовік нёс рэгулярную кур'ерскую службу ў ваенных белагвардзейскіх арганізацыях Варшавы, Прагі, Белграду і Парыжу, знаходзячыся ў сувязі з гэнэралам Мілерам.**

Малюнак з жыцьця беспрацоўных у Польшчы

Гаспадарчы развал у фашысцкай Польшчы адбываецца далей. З кожным месяцам, тыднем і днём павялічваецца армія беспрацоўных, а разам з тым і бяздомных. Праўда, хаця ўрадавая статыстыка, як зазначае сацыял-фашысцкі «Роботнік», **«мае цудоўны спосаб»** зьмяншаць лічбу беспрацоўных шляхам **незарэгістраваньня вялізарнейшай колькасьці беспрацоўных,** аднак, гэта ня зьмяняе становішча. Ад гэтага крызіс ня спыніцца.

Голад і галеча сярод працоўных мас, асабліва сярод беспрацоўных дасягнулі надзвычайных разьмераў. Расьце колькасьць бяздомных. У аднэй толькі Варшаве ў жніўні ў бараках для бяздомных знаходзілася **4.186 сем'яў--17.583 чал.** Як зазначае нават сацыял-фашысцкі орган, гэта лічба далёка **не адлюстроўвае сапраўднага стану бяздомных у Варшаве.** Вялізарная колькасьць бяздомных разьмясьцілася ў казармах, розных будах, у начлежных дамох. Так, на працягу ліпеня ў начлежных дамох у аднэй толькі Варшаве начавала 32.404 чал.

«Але што будзе! — пытаецца трывожна сацыял-фашысцкі «Роботнік», — **калі прыдуць першыя маразы, калі вернуцца гэтыя беспрацоўныя з вёскі, калі начлежныя дамы будуць так перапоўнены, што ня хопіць месца ня толькі на брудных нарах, але нават на запляванай падлозе?»**

Сацыял-фашысцкі орган не таму так непакоіцца, што яму дарагі і блізкі інтарэсы гэтых ахвяр капіталістычнага ладу. Рэвалюцыйная хваля ўзьнімаецца ўсё вышэй і больш грозна. Сацыял-фашысцкія здраднікі дрыжаць за сваю шкуру перад надыходам часу расплаты.

Высяленьне беспрацоўных з кватэр на падставе судовых прыгавораў з набліжэньнем восені і зімы ўсё больш павялічваецца. Так, той-жа «Роботнік» ад 24 жніўня паведамляў, што **ў аднэй толькі Варшаве на працягу двух дзён было зьмешчана ў бараках для бяздомных 21 сям'я беспрацоўных са 103 душамі, выселеных за няўзнос кватэрнай платы.**

У якім становішчы знаходзяцца гэтыя беспрацоўныя — бяздомныя лепш за ўсё сьведчыць сама-ж фашысцкая прэса.

«На вуліцы Батэрыя (у Вільні), пад адкрытым небам на бруку разьмясьціліся выселеныя з кватэры сем'і беспрацоўных. Пры невялічкім дымным вогнішчы,—счарнелыя і абарваныя людзі. На зямлі кучка босых дзяцей. Ніякіх рэчаў і вопраткі няма. Ляжаць толькі зваленыя ў кучу пара пагнутых ложкаў. 7 сем'яў, якія маюць звыш 20 дзяцей, маюць адзін толькі матрац. Падушкі, шафы, лепшая вопратка — даўно ўсё прадана на харчы. Сёньня яны сьпяць на мяшкох, накрываюцца мяшкамі. Яны ня маюць ніякага шалаша або палаткі. Усе сьпяць пад адкрытым небам. У нядзелю і суботу ішоў дождж. Дзеці і бацькі курчацца пад падзертымі плашчамі. («Кур'ер Віленскі» № 201).

Яшчэ больш яркім прыкладам проста жудаснага становішча беспрацоўных і бяздомных зьяўляецца наступны факт, зьмешчаны ў **«Газэце Варшаўскай»** ад 27 верасьня. «Доўгі час у мястэчку **Галаногу** (Дамбрэўскі басэйн) курсавалі чуткі аб духах, якія палохаюць праходжых на мясцовых могілках. У сувязі з гэтым паліцыяй была праведзена на могілках аблава, у выніку якой быў затрыман нейкі Ян Пэндзінскі, беспрацоўны з Кутна. Пэндзінскі знойдзен у магільным склепе ў труне. На запытаньне паліцыі, заявіў, што ён беспрацоўны і даўно ўжо жыве ў магільным склепе на могілках. Спаў ён у труне, з якой выкінуў струхлелыя косьці нябожчыка. У труне знойдзена лямпа, матрац, брытва і прылады да галеньня, кавалак хлеба і г. д.» Пэндзінскі арыштаваны і аддадзены пад суд. Можна было-б прывесьці вялікую колькасьць фактаў, але і гэтых даволі, каб паказаць, як капіталізм асуджае рабочую клясу на павольнае выміраньне.

Пісьменьнік Давід Бэргельсон у Менску

У Менск прыехаў буйнейшы яўрэйскі пісьменьнік т. **Давід Бэргельсон,** які пражывае ў апошні час у Бэрліне.

Вышаўшы ў Савецкім саюзе новы раман т. Бэргельсона «У Днепра» — першы том задуманай трылёгіі па-майстэрску адлюстроўвае нарастаньне клясавай барацьбы напярэдадні рэвалюцыі 1905 г. У гэтай кнізе з выключным майстэрствам даны вобразы яўрэйскай мястэчковай беднаты.

Яўрэйскі буржуазны друк заграніцай прыняў у штыкі гэту новую кнігу Бэргельсона, эганьбіўшы яе як «тэндэнцыйна рэвалюцыйны» твор.

Тав. Бэргельсон у радзе сваіх апошніх публіцыстычных артыкулаў даў рэзкі адпор інтэрвэнцыянісцкаму яўрэйскаму друку, які распускае паклёпы супроць Савецкага саюзу.

У Савецкім саюзе т. Бэргельсон прабудзе доўгі час.

З Менску тав. Бэргельсон едзе ў Бірабіджан па заданьні яўрэйскай газэты кампартыі ПАЗШ «Морген Фрайгат», пастаянным супрацоўнікам якое ён зьяўляецца.

У Менску з удзелам т. Бэргельсона наладжваецца рад вечароў.

Першы вечар адбыўся 30 верасьня ў цэнтральным яўрэйскім партыйным рабочым клюбе імя Левіна.

Тав. ДАВІД БЭРГЕЛЬСОН.

Забясьпечым сваячасовы пачатак вучобы ў КІЖ'ы

Пастанова ЦК КП(б)Б аб арганізацыі ў БССР Камуністычнага інстытуту журналістыкі — вышэйшай камуністычнай школы па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кіруючых кадраў газэтных работнікаў — была падхоплена з вялікім энтузіязмам у партыйных арганізацыях Беларусі. Аб гэтым сьведчаць пастановы раду парткомаў і іх праробленая работа па ўкамплектаваньні КІЖ'у вытрыманымі партыйцамі, якія поўнасьцю адпавядаюць умовам прыёму.

Менскі гарадзкі камітэт партыі першы паказаў прыклад узорнай барацьбы за выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб укамплектаваньні КІЖ'у. Вялікую работу прарабілі таксама і Гомельскі, Аршанскі, Клічаўскі, Мсьціслаўскі, Чэрвеньскі, Клімавіцкі, Заслаўскі і Быхаўскі райкомы КП(б)Б. Яны выканалі разьвёрстку ЦК КП(б)Б, паслаўшы на вучобу ў КІЖ лепшых партыйцаў, адказных таварышоў, якія змогуць з гонарам ажыцьцяўляць задачы, пастаўленыя перад імі партыяй.

Трэба, аднак, канстатаваць, што ня ўсе райкомы КП(б)Б правільна ацанілі пастанову ЦК КП(б)Б. Некаторыя райкомы ня толькі не прынялі да гэтага часу мер, каб выканаць разьвёрстку ЦК па ўкамплектаваньні КІЖ'у, але безадказна, па-апартуністычнаму падыходзяць да гэтай важнай справы. І гэта ня гледзячы на зусім выразную пастанову і неаднаразовыя тэлеграмы і ўказаньні культпропу ЦК КП(б)Б.

Падамо некалькі характэрных прыкладаў. Тураўскі райком КП(б)Б ня змог знайсьці ў сваёй раённай арганізацыі іншай кандыдатуры для пасылкі на вучобу ў КІЖ, як толькі члена партыі са стажам з **1932 году. Магілеўскі, Рэчыцкі, Мазырскі, Віцебскі, Бабруйскі, Полацкі і Жлобінскі** раёны — раёны з вялікімі партарганізацыямі, якія налічваюць рад буйных прадпрыемстваў, буйных саўгасаў і калгасаў.

Няўжо-ж і ў гэтых партарганізацыях нельга падабраць сваячасова патрэбную колькасьць партыйцаў, якія падыходзяць па правілах прыёму і паслаць у КІЖ? Сьмешна нават і пытаць аб гэтым. Але факт застаецца фактам: да сёньняшняга дня ні адзін з памянёных райкомаў ня прыслаў ні аднэй анкеты, за выключэньнем Магілева, адкуль паступіла **толькі адна анкета.**

Калі прыслухацца да разважаньняў паасобных работнікаў некаторых райкомаў, можна на першы погляд прысьці да вываду, што ў арганізацыях няма такіх партыйцаў, якіх можна было-б паслаць у КІЖ. Але гэта **не адпавядае сапраўднасьці,** бо рад райкомаў знайшлі людзей і поўнасьцю выканалі разьвёрстку. Аб поўнай магчымасьці выкананьня разьвёрсткі сьведчаць заявы, якія паступілі ў КІЖ ад раду членаў партыі **паміма** райкому КП(б)Б.

Вось, напрыклад, член партыі Слуцкай арганізацыі тав. **Ждан** падаў заяву аб паступленьні ў КІЖ. На запытаньне кіраўніцтва КІЖ'у аб згодзе райкому аб водпуску тав. Ждана на вучобу, Слуцкі райком разразіўся прамам:

«Бюро слуцкага РК КП(б)Б катэгарычна пярэчыць супроць водпуску тав. Ждана на вучобу ў КІЖ, бо т. Ждан нядаўна перакінут на працу ў рэдакцыю «Ленінскі шлях», дзе не хапае значнай колькасьці працаўнікоў».

Можна не пярэчыць супроць таго, што т. Ждана не пасылаюць у гэтым годзе на вучобу. Справа ня ідзе аб данай кандыдатуры. Але чаму наогул слуцкі РК не пасылае на вучобу ў КІЖ ніякай кандыдатуры?

Мы ахвотна верым бюро слуцкага РК, што ў рэдакцыі раённай газэты «не хапае значнай колькасьці працаўнікоў». Дазвольце-ж запытацца ў вас, таварышы з Случчыны: колькі ня будзе хапаць у вас работнікаў рэдакцыі ў будучым годзе, калі вы так **лёгка** будзеце адносіцца да ажыцьцяўленьня задачы падрыхтоўкі кадраў газэтных работнікаў?

Такія адносіны сьведчаць толькі аб блізарукасьці работнікаў.

Тэрмін, які быў устаноўлен ЦК КП(б)Б на сканчэньне ўсёй работы па наборы ў КІЖ — 20 верасьня — даўно ўжо прайшоў. З 1-га кастрычніка пачынаюцца іспыты, а з 15 кастрычніка павінны распачацца заняткі першага курсу.

Задача райкомаў КП(б)Б забясьпечыць у бліжэйшыя дні поўнае выкананьне разьвёрсткі ЦК КП(б)Б і сваячасовы пачатак вучобы ў КІЖ'ы.

Б. Шпітальнік.

Паведамленьні

— Сёньня ў 11 гадз. раніцы ў габінэце тав. Чарнушэвіча (ЦК КП(б)Б) адбудзецца **пасяджэньне цэнтральнай камісіі па правядзеньні сьвяткаваньня 15-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

Яўка членаў камісіі абавязкова.

Выклікаюцца старшыні камісій па падрыхтоўцы сьвяткаваньня гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі пры цэнтральных установах і арганізацыях.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. Анісімава Якуба Рыгорава (былы працаўн. Белсамправ саюзу) зьявіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б або паведаміць свой адрас, месца жыхарства і работы (Менск, Савецкая, 55, 3-ці паверх, пакой № 18). Просьба да ўсіх партарганізацый, якія ведаюць месца знаходжаньня памянёнага таварыша, паведаміць ПК ЦКК КП(б)Б.

Адказны рэдактар—Г. Н. БРАГІНСКІ.

Чыр. Зорка	Пач. у 6, 7-30, 9, 10-30. Каса з 1 г. дня	Нашумеўшы фільм МАНОН (Белая моль) Звыш праграмы хроніка Саюзкіно НАШ ГОРКІ
Інтэрнацыянал	Пач. 6, 7-30, 9, 10-30	Мастацкі савецкі фільм ПЕСЬНЯ ПРА ПЕРШУЮ ДЗЯЎЧЫНУ Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.
Пралетары		Мастацкі фільм Хлапец з берагоў Місуры. Дзенныя дзіцячыя сэансы АЛЕНЬНІ ЯЗДОК
„СПАРТАК"	Пач: у 7, 8-15, 9-30, 11. Каса—з 5 г.	Мастацкі фільм АЛІМ (Крымскі джыгіт) драма ў 7 частках.

Да ведама прадпрыемстваў і ўстаноў.
СЭКТАР КАДРАЎ Бел. „ОСУ" (б. „ОРУ")
РЫХТУЕ
РАХУНКАВОДАЎ, БУХГАЛЬТАРАЎ, ст. БУХГАЛЬТАРАЎ і СТАТЫСТЫКАЎ
ДЛЯ РАБОТЫ НА РАЁНЕ.
Гаспадарчым органам для заключэньня дагавароў належыць зварачацца ў канцылярыю Бел. «ОСУ» (Камуністычная д. № 16, «УНХУ» 2-гі паверх, пакой № 11) ад 10 да 11 гадз. дня.

Бабруйскі Лесатэхналёгічны Тэхнікум ПРАЦЯГВАЕ ЧАРГОВЫ НАБОР
СТУДЭНТАЎ НА 1-шы КУРС дзеннага і на 1-шы КУРС вячэрняга тэхнікуму
на аддзяленьні: фанэрнае, лесапільнае, сталярна-буд.
У тэхнікум прымаюцца скончыўшыя 7-годкі вячэрнюю школу павышанага тыпу і іншыя школы,—адпавядаючыя праграмам 7-годкі або гадавых тоўчых курсаў ў тэхнікумы. Жадаючыя паступіць павінны падаць заяву на імя прыймовай камісіі тэхнікуму па адрасе: г. Бабруйск, Савецкая № 76. Лесатэхнікум да 10 кастрычніка. Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакуманты: анкета, засьведчаная прафарганізацыямі, а для сялян—сельсаветам, пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал), пасьведчаньне аб сацыяльным паходжаньні і стане ў сучасны момант (сялянам даведку ад сельсавету аб разьмеры с.-г. падатку), мэтрычная спраўка, даведка аб стане здароўя, аб адносінах да вайсковай павіннасьці, дзьве фотакарткі, паштовых марак на 50 кап. Правілы для паступленьня ў вячэрні тэхнікум тыя-ж, што і на дзенны, за выключэньнем таго, што навучаньне будзе праходзіць без адрыву ад вытворчасьці. 55 проц. агульнага ліку студэнтаў забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у разьмеры ад 25 да 120 руб.
Дырэктар Лесатэхнікуму ШТЫЦЬКО.

ВІЦЕБСКІ ІНДУСТРЫЯЛЬНА-ПЭДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ абвяшчае, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ на асеньні набор працягнут да 15 кастрычніка 1932 году.
Інстытут рыхтуе выкладчыкаў для ФЗС і ФЗВ. Прымаюцца асобы, скончыўшыя 9-годкі, рабфакі, тэхнікумы і падрыхтоўчыя курсы ВНУ. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. З залічанымі да 1 кастрычніка заняткі пачынаюцца з 1 кастрычніка. Аднача сова абвяшчаецца прыём на падрыхтоўчыя курсы пры ВІПІ. Дакуманты накіроўваць ў канцылярыю ВІПІ і Пушкінская № 3.
ДЫРЭКЦЫЯ.

1-га кастрычніка, у 6 гадзін вечара, у Доме Пісьменьніка АДБУДЗЕЦЦА нарада крытыкаў і літаратуразнаўцаў па пытаньні аб падрыхтоўцы да 15 гадавіны кастрычніка.
На нараду запрашаюцца крытыкі і літаратуразнаўцы гор. Менску.
Аргкамітэт саюзу савецкіх пісьменьнікаў.

Сэктар кадраў НКФ БССР
АБВЯШЧАЕ
НАБОР АСЬПІРАНТАЎ
пры Беларускім ФЗІ па спэцыяльнасьцях:
1) Фінансы СССР і капіталістычных краін.
2) Крэдыт і грошы СССР і капіталістычных краін.
3) Эканоміка і фінансаваньне сац. прамысловасьці.
4) Сацыялістычны вучот.
У асьпіранты прымаюцца асобы, скончыўшыя фінансавыя інстытуты і аддзяленьні, а таксама асобы, якія маюць закончаную вышэйшую акадэмічную адукацыю ва ўзросьце ад 20 да 35 год.
Пры падачы заяў неабходна прыкладаць: засьведчаныя: уласны жыцьцяпіс, анкету асьпіранта, водзывы партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый, даведкі: аб сац. паходжаньні і стане здароўя, пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал). Асьпіранты забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 225 руб. у месяц і кватэрнымі грашыма. Кватэры інстытут не дае.
Заявы з дакумантамі прымаюцца штодзенна да 1 лістапада 1932 г. канцылярыяй інстытуту—Менск, Савецкая, Унівэрсытэцкі Гарадок, галоўны корпус, пакой 203.

ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе дакумантаў у газ. „Зьвязда" НЯ ПРЫМАЮЦЦА

2-Х—г. г. роўна ў 6 гадз. вечара Мен. ГК КП(б)Б СКЛІКАЕ нараду сакратароў і агітмасавых работнікаў парткалектываў ячэек гораду.
Нарада адбудзецца ў залі пасяджэньня Менгаркому. Яўка абавязкова і без спазьненьня.
Менгарком КП(б)Б.

Насустрач 15 гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі
Сёньня ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Зьвязда" у 6 гадз. вечара. (Савецкая, 63, 3-ці паверх)
рэдакцыя газэты „Рабселькор", Менгарком КП(б)Б і Беларускі Камітэт эспэрантыстаў
СКЛІКАЮЦЬ НАРАДУ
рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражак, эспэрантыстаў гораду і таварышоў, якія ведаюць замежныя мовы
На нарадзе будуць абгавораны пытаньні:
1. Аб інтэрнацыянальнай сувязі фабрычна-заводзкага друку з камуністычнымі газэтамі і рабселькорамі замежных краін.
2. Выступленьне рэдактароў шматтыражак фабрыкі „Кастрычнік", заводу «Бальшавік», „Камунар", калектыву цягі (Менскі чыгуначны вузел) і шчотачнай фабрыкі.
Прысутнасьць усіх рэдактароў шматтыражак і ўказаных асоб абавязкова.
„Рабселькор"
Менгарком КП(б)Б
Беларускі Камітэт эспэрантыстаў

МЕНГАРКОМ КП(б)Б
СКЛІКАЕ
шырокую нараду трыкутнікаў ВНу, ВТНУ і тэхнікумаў
па пытаньні рэалізацыі пастановы ЦВК СССР аб вышэйшай школе.
На нарадзе будзе пастаўлен даклад аб задачах вышэйшых навучальных устаноў у сувязі з пастановай ЦВК СССР. Даклад с месц (будаўнічы інстытут, палітэхнікум, аўта-дарожны камбінат, ВПІ). Нарада адбудзецца ў памяшканьні Менгаркому КП(б)Б 1 кастрычніка 1932 г., роўна ў 6 гадз. вечара (пакой № 32).
Яўка трыкутнікаў абавязкова.

ДОМ КАМАСЬВЕТЫ ІМЯ К. МАРКСА.
2 кастрычніка
УРАЧЫСТАЕ АБ'ЯДНАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ
акадэміі БАН, аргкамітэту пісьменьнікаў і ЦБ секцыі навуковых работнікаў,
прысьвечанае 40-гадоваму юбілею літаратурнай дзейнасьці Максіма Горкага.
1) Даклад акадэміка І. І. Замоціна —40 год служэньня пралет. мастацтву (да 40 год дзейн. М. Горкага). Даклад акадэміка С. Я. Вальфсона—М. Горкі ў рэвалюцыйным руху. 2) Мастацкая частка Пачатак у 7 г. 30 м.
Уваход па запрашальных білетах.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ у Аршанскі пэдагагічны інстытут ПРАЦЯГНУТ да 15 кастрычніка
Дырэкцыя.

У МЕНСКУ мяняю кватэру з 2-х пакояў з выгодамі ў цэнтры гораду на 1—2 пакоі ў Маскве. Даведацца з 10 гадзін раніцы да 3 г. па тэл. камутатар ЦК 64 і з 4 г. па № 1204 ЭПШТЭЙН.

Плянава-Эканамічны Інстытут паведамляе, што ЗАНЯТКІ СА СТУДЭНТАМІ вячэрніх груп інстытуту і рабфаку пачнуцца 5-га кастрычніка.
Аб пачатку заняткаў са студэнтамі дзенных груп будзе паведамлена кожнаму прынятаму асобна.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Вышэйшы пэдінстытут паведамляе, што ЗАНЯТКІ ПРЫНЯТЫХ на літаратурнае, газэтна-выдавецкае, эканамічнае і гістарычнае аддзяленьні
ПАЧЫНАЮЦЦА 5 кастрычніка,
а на аддзяленьні дзэтнамруху і пэдалёгічным—25 кастрычніка.
Кожнаму паслана асобнае паведамленьне.
Нам. дырэктара ВПІ Рыдзеўскі.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону № 6-18